ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

На 1 мес
„ 3 мес
„ 6 мес
„ 12 мес.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „Звязда" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЇН, ЗЛУЧАЙЦЕСЬ!

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Адвел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

СЕРАДА, 7 мая 1930 г.
№ 105 (3703)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

УМО
9пл. Москва, Библиотека ВСНХ СССР
От.Сьн /Зв. I/

На шляхох да 16 зьезду

Да 16-га зьезду партыя прыходзіць, як ніколі, адзінай, згуртаванай наўкола сваёй генэральнай лініі — вайго Цэнтральнага Камітэту, яшчэ мацней зьвязанай з шырокімі пралетарскімі, батрацка-бядняцкімі і серадняцкімі масамі.

16-ты зьезд падагуліць вопыт больш, чым 2-гадовай, багацейшай па сваім размаху і зьмесьце работы і вызначыць шляхі, якія забясьпечваюць далейшае ўзмацненьне міжнародных пазыцый Савецкага Саюзу і яго тэхніка-эканамічнай незалежнасьці ад капіталістычных краін, якія садзейнічаюць далейшаму ажыцьцяўленьню курса на індустрыялізацыю краіны, на разьвіцьцё і далейшую рэканструкцыю буйнай сацыялістычнай прамысловасьці, калектывізацыю сельскае гаспадаркі і культурную рэвалюцыю.

Зьезд паньвердзіць узяты партыяй курс на далейшае паступленьне на капіталістычныя элементы гораду і вёскі, па выкарчоўваньне саміх карэньняў капіталізму і ліквідацыі кулацтва, як класы, на аснове праводзімай суцэльнай калектывізацыі.

Зьезд сваімі пастановамі забясьпечыць далейшае ўзмацненьне арганізацый, якія зьвязваюць партыю з масамі, перш за ўсё прафсаюзаў. Зьезд прыме пастановы, якія лягуць у аснову далейшага якаснага і колькаснага ўзмацненьня партыйных радоў.

Зьезд падагуліць вынікі цэлай паласе барацьбы партыі з антыленінскімі ўхіламі і хістаньнямі, намеціць шляхі далейшае рашучае перамогі правага апартунізму, які прадстаўляе галоўную небясьпеку на даным этапе нашага разьвіцьця і «левага» ухілу, які выконвае ролю саюзьніка правых апартуністых.

Зьезд зьяўляецца выказчыкам калектыўнага розуму і волі партыі і зможа вырашыць складаныя і адказныя задачы, якія стаяць перад ім, толькі пры ўмове шырокай падрыхтоўчай работы з боку ўсёй партыйнай масы, з боку кожнай партыйнай арганізацыі.

Гэтым перш за ўсё і вызначаецца значэньне, характар і зьмест справаздачна-перавыбарчай кампаніі, якая адбываецца цяпер. У пераважнай большасьці органаў партыі справаздачна-перавыбарчая кампанія знаходзіцца на высокім прынцыповым узроўні і праходзіць на базе вялізарнай актыўнасьці партыйных мас. У цэнтры ўвагі стаяць пытаньні, якія непарыўна зьвязаны з далейшым разьвіцьцём сацыялістычнага будаўніцтва.

Аднак, нельга абысьці таго факту, што ў асобных арганізацыях мы назіраем яўна невыстарчальную падрыхтоўку да зьезду. Гэта перш за ўсё выяўляецца ў невыстарчальнай увазе да справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Ёсьць асобныя выпадкі, калі партыйныя арганізацыі разглядаюць гэту кампанію на-за сувязьзю з генэральнай праверкай усёй партыйнай работы.

У гэтых арганізацыях недапушчальна дрэнна праводзіцца растлумачальная работа аб задачах справаздачна-перавыбарчай кампаніі і самога зьезду. Як вынік гэтага, у такіх выпадках падрыхтоўка да кампаніі, а значыць, і да зьезду, ня посіць масавага і палітычнага характару.

У працэсе самой справаздачна-перавыбарчай кампаніі асобныя арганізацыі не замілі згуртаваць увагу на праверцы і ацэнцы ўсёй сваёй работы на практычным выкананьні генэральнай лініі партыі. Невыстарчальнае месца часамі адводзіцца барацьбе партыі на два фронты і крытыцы канкрэтных посьбітаў правага і «левага» ўхілаў і прымірэнчых адносін да іх. Шмат арганізацый упускаюць з-над увагі пытаньне адзінаначальня, парткіраўніцтва прафработай і павышэньня рэальнай зарплаты.

У радзе савецкіх ячэек на справаздачных сходах невыстарчальна адбіваецца барацьба з бюракратызмам, рацыяналізацыйнай апарату і яго арабочаньнем, паляпшэньнем абслугоўваньня патроб працоўных мас і г. д. У цэлым радзе гарадзкіх ячэек не знаходзяць адбітку пытаньні, зьвязаныя з палітыкай партыі ў вёсцы, умацаваньня сувязі з вёскай і ўзмацненьня пралетарскага ўплыву ў ёй.

У некаторых вясковых арганізацыях невыстарчальна завастраецца ўвага на выпраўленьне перагібаў па якасным замацаваньні дасягнутых посьпехаў у калгасным будаўніцтве, у правядзеньні бальшавіцкай сяўбы і пастаноўкі палітычнай работы сярод батрацка-бядняцкіх і серадняцкіх мас.

Вельмі часта справаздачна-перавыбарчая кампанія не выкарыстоўваецца для вярбоўкі партыяй рабочых, батракоў, беднякоў і лепшых сераднякоў з калгаснікаў для ўзмацненьня работы сярод жанчын і парткіраўніцтва камсамолам. Тэрмін, які застаўся яшчэ да зьезду, павінен быць выкарыстаны для шырокай прапаганды і поўнага ўяўленьня партыйнымі і беспартыйнымі масамі чарговых задач партыі як у галіне прамысловасьці, так і ў галіне далейшага разьвіцьця калгаснага руху.

Партыйныя масы павінны быць мабілізаваны на непрымірымую барацьбу супроць правых і «левых» апартуністых, якія зноў прабуюць атакаваць лінію партыі. Трэба бязьлітасна выкрываць антыленінскі характар «навейшых» апартуністычных тэорый аб самацечным разьвіцьці вёскі, аб «адступленьні», аб «паражэньні» і г. д. і г. д. З асаблівай настойлівасьцю трэба растлумачваць масам, што «левыя» загібы па сутнасьці ўзмацняюць пазыцыю правых ухілістых. Трэба моцна ўдарыць па праяўленьнях прымірэнчых адносін да правага апартунізму і «левых» загібаў.

Перад падыходзячым зьездам партыі не павінна быць ні аднэй партыйнай арганізацыі, не праверыўшай сваёй клясавай баяздольнасьці. Пры праверцы работы партыйных арганізацый мы павінны, з аднаго боку, карыстацца выпрабаванай зброяй бальшавіцкай самакрытыкі, яшчэ больш, яшчэ шырэй і больш тлыбока разьвіваючы яе ў інтарэсах сацыялістычнага будаўніцтва, у барацьбе за генэральную лінію партыі. З другога боку, мы з асаблівай сілай абавязаны ўдарыць па тых, хто прабуе выкарыстаць самакрытыку ў мэтах рэвізіі генэральнай лініі партыі і прыкрыцьця хістаньняў у бок асобнай лініі.

У падрыхтоўцы да зьезду вялізарную ролю павінен адыграць друк. Абласныя і акруговыя газэты павінны дапамагаць партыйным арганізацыям мабілізаваць масы паўкола задач справаздачна-перавыбарчай кампаніі, роўна, як і паўкола задач самога зьезду партыі, які зьявіцца новай гістарычнай вехай у разьвіцьці сацыялізму ў нашай краіне, ва ўзмацненьні пазыцый міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі. («Правда»).

Разгром беларускіх культасьветных установаў у Зах. Беларусі

Падрыхтоўку ўзброенага паходу на СССР польскі фашызм ставіць галоўнай задачай усёй сваёй палітыкі. Падрыхтоўка-ж тылу будучага тэатру ваенных дзеяньняў зьяўляецца аднэй з важнейшых галін у гэтай падрыхтоўцы.

Гэтым і тлумачацца бязупынны тэрор і рэпрэсіі польскага фашысцкага ўраду ў адносінах да нацыянальна-вызваленчага руху ў Зах. Беларусі, асабліва ў адносінах да культурна-асьветных арганізацый беларускіх працоўных мас— у першую чаргу да ТБШ. Трэба сказаць, што рэпрэсіі, прасьледаваньні дзеячоў з ТБШ ніколі ня спыняліся, а ў некаторых паветах, як **Слонімскі, Ваўкавыскі, Гарадзенскі, Вяйейскі, Маладэчанскі і Пастаўскі** гэтыя рэпрэсіі зрабіліся нават **сталымі мэтадамі адміністраваньня.**

Нядаўна атрыманы намі падрабязныя весткі аб хвалі арыштаў і вобыскаў сярод членаў ТБШ на тэрыторыі амаль усёй Заходняй Беларусі, якія адбыліся ў пачатку лютага г. г.

Паводле гэтых вестак, у пачатку лютага было **разгромлена 5 акруговых управаў ТБШ і сотні гурткоў на тэрыторыі усёй З.Б.** Характэрным момантам гэтага апошняга паходу польскага фашызму супроць беларускіх рабоча-сялянскіх культурна - асьветных установаў З.Б. зьяўляецца тое, што **вобыскі і арышты адбыліся** нібы паводле знаку «чароўнай палачкі»—**у адну ноч на абшары некалькіх паветаў,** прычым справы ўсіх арыштаваных перададзены судовым уладам. Рэпрэсіі ўжываліся выключна ў адносінах да членаў ТБШ, у якіх шукалі цейкай камуністычнай літаратуры, адозваў беларускага Рабоча-Сялянскага пасольскага клюбу і г. д., прычым не абышлося і без правакацый—гэтага улюбёнага мэтаду польскага фашызму для здабыцьця матар'ялу «обнажаённых».

Найбольш «трэсьлі», найбольш арыштаў было ў паветах **Слонімскім, Косаўскім, Ваўкавыскім, Стаўпецкім і Пастаўскім.**

У выніку гэтага паходу польскага фашызму супроць ТБШ, у Казловіцкім гуртку **(Слонімскі павет)** было арыштавана 15 членаў. Арыштаваны таксама члены б. Слонімскай акруговай управы **Любецкая і Жытковіч.**

У **Косаўскім павеце** ва ўсіх членаў Акруговай управы і на ўсіх гурткох ТБШ у адзін дзень адбыліся вобыскі. **Маса арыштаваных адаслана ў Пружанскую турму.**

У **м. Сьвіслачы (Ваўкавыскі павет) разгромлена акруговая управа і мясцовы гурток. Чатыры члены управы—Варановіч, Ёська, Піваварчык і Трахімчык былі адвезены ў Беластоцкую турму.**

У **Стаўпецкім павеце** арыштаваны старшыня і намесьнік старшыні акруговай управы, а іншыя члены управы ўзяты былі пад нагляд паліцыі. У часе вобыску забраны пратаколы зьезду ТБШ ад 19-V—1929 году і **прамовы паслоў беларускага сялянска - работніцкага пасольскага клюбу.**

У **Баранавіцкім і Пастаўскім** паветах вобыскі адбыліся па ўсіх членаў акруговых управаў. Арыштаваны ўсе члены акруговых управаў у гэтых паветах. У Пастаўскім-жа павеце для большага стэрарызаваньня насельніцтва арыштаваны былі нават старыя сяляне-бацькі, сыны якіх зьяўляліся членамі ТБШ.

У **Пружаншчыне** — пераглядзьлі амаль усе гурткі, маса арыштаваных сялян была адаслана ў Пружанскую турму.

У **Гарадзенскім павеце вобыскі і арышты** адбыліся амаль ва ўсіх гурткох. Асабліва зьверствы ў часе вобыскаў праявіла паліцыя і дэфэнзыва ў гмінах **В.-Бераставіцкай, Азерскай, В.-Эйсмантаўскай і Скідэльскай.** Тут многія члены гурткоў былі зьбіты да страты прытомнасьці, акрамя таго, на загаду старосты, прымушаны былі даць падпіску аб выхадзе са складу гурткоў. Такі масавы тэрор адбываўся ва ўсіх куткох Заходняй Беларусі.

Ініцыятарамі і дапаможнікамі польскаму фашызму ў разгроме гэтых акруговых управаў ТБШ зьяўляюцца **беларускія нацыянал-фашысты з Луцкевічам і К.° на чале.** Іх дэфэнзыўная работа ўсім добра відома. Мы добра памятаем, як для «заспакаеньня» вучняў нацыянал - фашысцкая хэўра выклікала ў Віленскую беларускую гімназію польскую паліцыю, як яна выдавала падросткаў - вучняў у рукі дыфэнзывы, як арганізоўвала і насылала групы наймітаў і дэфэнзыўшчыкаў для разгрому Сакратарыяту беларускага работніка - сялянскага клюбу ў Вільні—і наогул усю іх правакацыйную дэфэнзыўную работу ў адносінах да нацыянальна - рэвалюцыйнага руху працоўных мас у Зах. Беларусі.

Гэта сацыял-фашысцкая хэўра ўсімі сіламі імкнецца да канчатковага разгрому ТБШ, каб такім чынам захапіць гэту культурна - асьветную арганізацыю ў свае рукі, зрабіць яе паслухамянай зброяй у руках польскага фашызму, каб мець лепшую магчымасьць падрыхтоўваць з працоўных мас паслухмянае гарматнае мяса для будучай вайны з СССР.

Гэты разгром 5-ці акруговых управаў ТБШ і раду гурткоў зроблены на ініцыятыве беларускіх нацыянал - фашыстых і зьяўляецца далейшым працягам усёй правакацыйнай работы гэтай зграі прыслужнікаў польскага фашызму. Адначасова ён зьяўляецца вынікам поўнага правалу усіх спроб пан-фашыстых сфашызаваць ТБШ знутры.

Аднак, ня гледзячы на такі шалёны тэрор польскага фашызму, на заключэньне лепшых прадстаўнікоў гэтай культурна-асьветнай арганізацыі ў турмы—ТБШ ня спыніла сваёй працы, не заняпала зусім. Месца выбыўшых па рацыбітоў занялі новыя і работа закіпела з новай сілаю. У **м. Сьвіслачы** ў лютым быў **поўны разгром акруговай управы і гуртку,** а ўжо 9-га сакавіка ладзіўся беларускі спэктакль. І такія выпадкі не адзінкавыя. За гэты кароткі тэрмін, які прайшоў ад разгрому акруговых управаў ТБШ, наперакор падрыўной работе беларускіх нацыянал-фашыстых, было арганізавана каля 20 новых гурткоў і заверабавана каля 1.000 новых членаў у таварыства. А гэта гаворыць аб тым, што карта польска-беларускага фашызму на фашызацыю ТБШ шляхам тэрору і рэпрэсій біта і на гэты раз. Ж.

ДА ЗАМАХУ НА НАША ПАЎПРЭДЗТВА Ў ВАРШАВЕ



НА ЗДЫМКУ: дах суседняга з паўпрэдзтвам дому. Відаць [illegible] з гадзіньнікавым мэханізмам, які злучаны провадам з пякельнай машынай.

Рэвалюцыйны рух у Індыі перакінуўся ў вёскі

РАЗГРОМ АРГАНІЗАЦЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА КАНГРЭСУ Ў ПЕШАВАРЫ

У Пешавары ўведзены закон аб «мяцежных сходах». Паводле гэтага закону, паліцыя ўжо абвяшчыла па-за законам мясцовыя арганізацыі нацыянальнага кангрэсу і арыштавала 17 нацыяналістых дзеячоў. **Разгром арганізацый нацыянальнага кангрэсу працягваецца.** Хваляваньні сярод пламеннуй паўночна-заходняй пагранічнай правінцыі пашырэцца. Ангельскае войска працягвае акупацыю Пешавара. Пасьля арышта Ганды, рэпрэсіі адразу ўзмацніліся. Закрыта звыш 100 газэт. У Бамбэі і іншых гарадох рада нацыянальнага кангрэсу з прычыны арышту Ганды праводзіць два дні жалобы. Усе індускія і мусульманскія крамы закрыты. Рабочыя масы ўзброіваюцца. Наступаючыя наведамленьні гавораць аб тым, што рэвалюцыйны рух шырока ахапіў сяляньні. (ТАСС).

ПОЎНАЕ БАНКРУТСТВА ІНДЫЙСКІХ НАЦЫЯНАЛІСТЫХ

ЛЕНДАН, 5. Адрывачныя весткі, на ступаючыя з Пешавару, з прычыны бязьлітаснай цэнзуры не даюць магчымасьці судзіць аб сапраўдным ходзе падзей у паўночна-заходняй пагранічнай паласе Індыі. Сёньня пачакана з Пешавару наступілі наведамленьні, якія выклікаюць зьдзіўленьне вячэрніх газэт. Аказваецца, што ў Пешавары ўлада на працягу 2-х тыдняў знаходзілася ў руках нацыяналістых. У наведамленьнях зазначаецца:

«Пасьля 2-х тыдняў бязуладзьдзя, на працягу якіх горад Пешавар у сапраўднасьці пікім ня кіраваўся, ваенныя улады сумесна з грамадзянскімі спакойна ўвайшлі ў горад 5 мая раніцою і заняліяго без усялякіх сутычак. Яшчэ да рассьвету часьці цалкам аўладалі галоўнымі вуліцамі. Насельніцтва было вельмі здзіўлена, убачыўшы прыбыцьце вайсковых сіл і ліквідацыю мірным шляхам рэжыму нацыянальнага кангрэсу. Ангельскае войска, якое прыбыла, застанецца ў горадзе, ня менш 2-х месяцаў. Ангельскія самалёты аказалі ўрадавым войскам вялікія паслугі».

ПЕШАВАР АМАЛЬ ДВА ТЫДНІ ЗНАХОДЗІЎСЯ Ў РУКАХ ПАЎСТАНЦАЎ

ЛЕНДАН, 6. У друк паступова прасочваюцца больш падрабязныя весткі аб падзеях у Індыі.

Пасьля баёў паўстанцаў з рэгулярнымі войскамі 23 красавіка Пешавар быў захоплены паўстанцамі і амаль 2 тыдні знаходзіўся ў руках ваеннай рады, арганізаванай мясцовым камітэтам нацыянальнага кангрэсу. Некаторыя вайсковыя індускія часьці перайшлі на сторону паўстанцаў. На чале рэвалюцыйнага руху ў Пешавары стаялі мясцовы камітэт нацыянальнага кангрэсу і Наўджаван Бхарат Сабха (юнацкая арганізацыя). Вялучая ім ваенная рада арганізавала паўстанцкі рух у вёсках паўночна-заходняга раёну і кіравала гэтым рухам.

У афіцыйным наведамленьні індыйскага ўраду гаворыцца: «Характэрнай рысай дзейнасьці арганізацыяй Пешавару зьявілася пашырэньне камуністычных дактрын і дэманстрацый з камуністычнымі сьцягамі і пад камуністычнымі лёзунгамі».

У апэрацыях, вынікам якіх зьявілася запяцьце гораду ўрадавым войскам, бралі ўдзел кавалерыя, пяхота і наветраныя сілы. Уладаю арыштавана 50 кіраўнікаў паўстаньня. У горадзе абвешчаны сэкс аблогі. ТАСС).

На фронце клясавай барацьбы

АНГЕЛЬСКІЯ ШАРСЬЦЯНЫЯ ТРЫМАЮЦЦА СТОЙКА

РЭВАЛЮЦЫЙНЫ КАМІТЭТ ВЫКРЫВАЕ ДВУДУШНІЦТВА РЭФАРМІСТЫХ

ЛЕНДАН, 5. Рэвалюцыйны забастоўны камітэт шарсьцянікаў у выпушчаным бюлетэні выкрывае двудушніцтва рэфармістых, якія прапанавалі бастуючым згадзіцца на зьніжэньне заработкі на 5¾ проц., і заклікае механікаў і электрыкаў да забастоўкі салідарнасьці. У Брэдфордзе і Шыплі арганізаваны харчавыя пункты, якія ўжо адпусьцілі 6.000 абедаў. Харчавыя пункты арганізоўваюцца таксама ў іншых раёнах забастоўкі.

ЗАБАСТОВАЧНЫ РУХ У ЯПОНІІ

ТОКІЕ, 5. Паводле афіцыйных даных дэпартаменту міністэрства ўнутраных спраў у Японіі за 1929 год было праведзена **576 забастовак, у якіх прымала ўдзел 77.444 рабочых.** Каментуючыя гэты даныя, ліберальны друк лічыць, што прычынай павялічэньня ліку забастовак зьяўляюцца: 1. Масавыя звальненьні рабочых; 2. Пагаршаньне жыцьцёвага ўзроўню рабочых; 3. Зьніжэньне і частая выплата заработнай платы. Усё гэта было выклікана рацыяналізацыяй і канцэнтрацыяй вытворчасьці і падрыхтоўкай мерапрыемстваў па забароне вываду золата.

Газэта «Ніхон Сякай Уидо Пухім» падае даныя аб сялянскім руху ў Японіі за 1929 год. На працягу гэтага году мелі месца 1.432 канфлікты. Асноўнай прычынай канфліктаў зьяўляецца пытаньне аб савецкай уладзе. (ТАСС).

ВОБЫСК Ў БЕЛАГВАРДЗЕЙЦА Ў ВІЛЬНІ

ВАРШАВА, 5. Газэты наведамляюць што ў часе вобыску ў белагвардзейца—былога царскага паліцэйскага Бутурліна ўпаўнаважанага „Рускага аб'яднаньня" ў Вільні знойдзены механізм гадзіньніка, які зьяўляў на сабе ўвагу паліцыі. Паліцыя затрымала Бутурліна і канфіскавала механізм гадзіньніка для перадачы яго сьледчым уладам. Вобыск быў зроблены ў сувязі з апошнім замахам на савецкае прадстаўніцтва ў Варшаве. Перадрукоўваючы гэта наведамленьне, газэта «Наш Ніпэглёд» піша: «Сьлады замаху вядуць у Вільню».

З пасеўнага фронту

НАСЕНЬНЕ НЕ ПРАТРУЧВАЕЦЦА

ПРЫНЯЦЬ РАШУЧЫЯ МЕРЫ ДА ВЫКАНАНЬНЯ ДЫРЭКТЫВЫ УРАДУ

З некаторых раёнаў БССР паступаюць весткі аб тым, што ня толькі індывідуальнікі, але нават і калгасы не зварачаюць належнай увагі на пратручваньне насеньня. Ёсьць такія калгасы, якія ужо закончваюць сяўбу, а да праведзеньня пратручваньня нават і не прыступаюць. Гэта сьведчыць аб тым, што як раённыя, так і сельсавецкія арганізацыі ў рэдзе месц зусім ігнаруюць пастанову ўраду аб абавязковым пратручваньні насеньня ў калгасах на 100 проц. і ў індывідуальных гаспадарках, як мінімум, — на 25 проц. Заўважаецца таксама, што асобы, якія скончылі спэцыяльныя курсы па барацьбе са шкоднікамі, мясцовымі арганізацыямі не скарыстоўваюцца і да арганізацыі пратручваньня ня прыцягнуты.

Белпаляводсаюз, у сувязі з гэтым, пазаўчора запрапанаваў сваёй сыстэме праз акруговыя паляводсаюзы тэрміновa праверыць выкананьне дырэктывы аб пратручваньні. Акруговым паляводсаюзам прадпісана прыняць самыя рашучыя меры супроць тых арганізацый, якія ігнаруюць выкананьне дырэктыў аб пратручваньні.

Неабходна, каб увага ўсёй вясковай грамадзянасьці была зараз зьвернута на поўнае выкананьне пляну пратручваньня насеньня як у калгасах, так і ў індывідуальным сэктары.

Ільготы за засеў канапель і кукурузы не папулярызаваны

МАЗЫР. (Ад нашага карэспандэнта). Сяўба ў акрузе ў самым разгары. За апошнюю пяцідзёнку пачалася масавая сяўба ў індывідуальным сэктары. **На 1-га мая калгасамі засеяна 9.362 гэкт. або 40 проц. яравога кліну. Лепш за ўсё ідзе сяўба ў калгасах Юравіцкага раёну, дзе засеяна 1.132 гэкт.—47 проц. яравога кліну. Далей ідзе Турэўскі раён, дзе калгасы таксама засеялі 47 проц. яравога кліну.**

Дрэнна ідзе сяўба ў калгасах Пятрыкоўскага раёну, дзе засеяна 22 проц. Калгасы Капылеўшчыны раёну засеялі 27,9 проц., Каралінскага раёну—30 проц.

Калгасамі ў акрузе засеяна 418 гэкт. пшаніцы (71 проц. плану), 5.275 гэкт. авсу (86 проц.), 1.168 гэкт. ячменю (... проц.), 364 гэкт. ільну (28 проц.), 5[illegible] гэкт. канапель (10 проц.), 10 гэкт. кукурузы (12 проц.) і 1.043 гэкт. канюшыны (60 проц.).

Індывідуальнымі гаспадаркамі ўжо засеяна 37.000 гэкт., або 33 проц. яравога кліну, з іх пшаніцы 3.481 гэкт. (11 проц.), ярыцы—1.601 гэкт. (254 проц.), авсу—14.845 гэкт. (65 проц.), ячменю 6.365 гэкт. (71 проц.), ільну—2.062 гэкт. (35 проц.), канюшыны—304 (25 проц.) і бульбы—7.914 гэкт. (25 проц.).

Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што сяўба ў калгасах пасунулася ўперад. Дрэнна ідзе сяўба ў сяўбе кукурузы і канапель. **Як індывідуальнікі, так і калгасьнікі [illegible] пра ільготы пасеўшчыкам кукурузы і канапель. Трэба зараз-жа правесьці самую шырокую растлумачальную работу пра гэтыя ільготы.**

У „КАМЕННЫМ БАРЫ" БЯЗЬДЗЕЙНІЧАЮЦЬ

Пашырэньне пасеўнай плошчы не забясьпечана

У Каменна-Борскім сельсавеце, Бярэзінскага раёну, Менскай акругі, ёсьць каля 40 гэкт. былой кулацкай зямлі, якая адведзена камітэтам сялянскай узаемадапамогі. На апошнія ўскладзеі абавязак абрабіць і засеяць гэту плошчу. Аднак, ні камітэты ўзаемадапамогі, ні сельсавет ня прымаюць належных мер у гэтым напрамку.

У Каменна-Борскім сельсавеце ёсьць таксама вольныя землі: асушаныя балоты, залежныя, занятыя хмызьнякамі і г. д. Сяляне прасілі сельсавет даць ім гэтыя вучасткі для апрацоўкі і засеву. Аднак, старшыня сельсавету, як відаць, не асабліва зацікаўлен засевам гэтых плошчаў, бо адказаў [illegible] такіх зямель няма».

Пры такіх адносінах [illegible] арганізацый да апрацоўкі [illegible] кулацкіх зямлі і тых плошчаў, якія да гэтага [illegible] ду не засяваліся, нагрэ[illegible] выкінана дырэктыва ўрада [illegible] пашырэньні пасеўнай плошчы не [illegible].

Трэба таксама адзначыць [illegible] адносіны да пасеўн[illegible] з боку малочна-жывёлагаду[illegible] таварыства. Апошняе не паклапа[illegible] нават за[illegible] бясьпечыць сельсавет [illegible] ранькіплодаў.

Н. Б.

Калгас „Уперад" робіць няпрацьна, АДМАЎЛЯЮЧЫСЯ ПРЫМАЦЬ У ЧЛЕНЫ ТЫХ, ХТО РАНЕЙ [illegible] З КАЛЕКТЫВУ

Калгас «Уперад», Нараўлянскага раёну, Мазырскай акругі налічвае 37 сем'яў. Пасевы раньніх культур ужо скончаны. Праца ў калгасе наладжана добра. З посьпехам ідзе арганізацыя жывёлагадоўчай гаспадаркі. Так, на сёньняшні дзень у калгасе «Уперад» ужо налічваецца 200 таварных кароў, 100 цялят, 45 коняй. Пасаджан рассадник пладовых дрэваў на плошчы 8 гэктараў.

Такія посьпехі калгасу зрабілі вялікі ўплыў на сялянства і, у прыватнасьці, на сялян вёскі Гурыцы, якія раней вышлі з калгасу. Зараз яны жадаюць зноў уступіць у калгас. [illegible] прымаюць, бо ня трэба [illegible] у «копку і мышку».

Х. ЗЕЛЬМАН.

Ад рэдакцыі: Такія [illegible] кіраўніцтва калгасам не [illegible] водным дырэктывам [illegible] і зьяўляюцца ніпрацьна. Трэба бязумоўна, прымаць [illegible] і сяраднякоў, якія жадаюць [illegible] у калгас. Калгас «Уперад» [illegible] пашыреп імкнуцца больш [illegible] калектыў бедняко[illegible] і сераднякоў [illegible] у гэтым напрамку [illegible].

Беспартыйная рабочая канфэрэнцыя Кастрычніцкага раёну

Шэфства над савецкім апаратам

(З дакладу тав. Лубуша)

5-га мая на вячэрнім пасяджэньні канфэрэнцыі заслухала даклад тав. **Лубуша** аб задачах шэфства над савецкім апаратам.

Праведзеная ў радзе цэнтральных і акруговых установаў чыстка — кажа дакладчык, — паказала, што дзяржаўны апарат засьмечаны былымі людзьмі, чыноўнікамі, гандлярамі і інш. Так, апарат Наркамфіну ўказаўся напалову з былых чыноўнікаў. Сямейнасьць, хабарніцтва, п'янства, падхалімства, сувязь з прыватнікамі,—усё гэта мела месца ў фінансавых органах. Тое самае было выкрыта і ў радзе іншых установаў (Полацкі ЦРК і інш.).

Патрэбны рашучыя меры для аздараўленьня такога апарату. Трэба ўстанавіць сыстэматычны работы кантроль над работай апарату. Для гэтага і арганізавана шэфства рабочых калектываў над установамі. Як-жа праводзіцца гэтае шэфства?

На жаль, да гэтага часу шэфства праводзіцца зусім незадавальняюча. У большасьці яно пакуль што заключаецца ў нарадных сходах, пасяджэньнях, заключаюцца дагаворы аб узаемных «паслугах» і г. д., практычнае-ж работы няма. На Кастрычніцкім раёне шэфства над установамі ўзялі 5 прадпрыемстваў: зав. «Энэргія»—над Наркамфінам БССР, гарбарня «Бальшавік» — над банкаўскімі установамі, гута «Пралетары»—над Наркамюстам, вагонныя майстэрні—над Белкаапсаюзам, ф-ка абутку—над МЦРК.

Але пры праверцы работы па шэфстве аказалася, што прадпрыемствы яшчэ нічога не зрабілі ў гэтым напрамку. Гута «Пралетары» напрыклад, пачала шэфства з таго, што дагаварылася з Наркамюстам аб арганізацыі сумеснага шэфства над вёскай. Гэта, бязумоўна, няправільна, як няправільна і тое, калі пачынаюць шэфства з заключэньня дагавораў аб узаемных «паслугах» (забясьпячэньне адзін другога прадуктамі і г. д.).

Наколькі дрэнна пастаўлена шэфства над установамі, характарызуе той факт, што з 30 брыгад на заводзе «Энэргія» на чыстку Наркамфіну зьявілася толькі... 5 чалавек.

Усе гэтыя факты гавораць самі за сябе. Трэба рэарганізаваць работу на шэфстве такім чынам, каб яна была сапраўды карыснай і давала тыя вынікі, якія ад яе патрабуюцца. Менш параднасьці, больш канкрэтнае работы, нам патрэбны рабочы кантроль над установамі, нам патрэбны школы, дзе-б выхоўваліся рабочыя - выдуначы, гэтым задачам і павінна адпавядаць работа на шэфстве.

Трэба адзначыць, што фабзаўкомы на прадпрыемствах мала цікавяцца шэфствам. На зав. «Энэргія» ў брыгады па шэфстве былі выдучаны т. т., якія маюць па 5-6 іншых нагрузак і ня могуць працаваць ў гэтай галіне.

Парткіны, камсамольскія, прафэсыянальныя арганізацыі таксама ўдзяляюць мала ўвагі гэтай важнай рабоце. Трэба дабіцца рашучага пералому ў шэфстве над установамі. Гэтая работа павінна быць у цэнтры ўвагі.

* *

Па дакладзе тав. Лубуша разгарнулася шырокая спрэчкі. Выказаліся т. т. **Багушэвіч** (служба эксплёатацыі станцыі Менск), **Кунцэвіч** (каўбасная фабрыка), **Войцік** (вагонныя майстэрні), **Мардуховіч** (майстэрні малога рамонту), **Пражмо** (фабрыка «Адраджэньне»), **Паўлавец** (вагонныя майстэрні), **Лемантовіч** (завод «Энэргія»), **Аверын** (ЦСНСВ) і **Плешакоў** (Кастрычніцкі РК КП(б)Б).

Канфэрэнцыю вітала дэлегацыя ад аб'яднанага пленуму Менскага АК і АКК КП(б)Б, які зараз адбываецца. З вялікай прывітальнай прамовай выступіў тав. **Аксючыц.**

* *

У спрэчках па дакладах выступіў рад дэлегатаў ад розных прадпрыемстваў Кастрычніцкага раёну. Дэлегаты заявілі ад імя рабочых калектываў, што яны прыкладуць усе намаганьні, каб выканаць і перавыканаць прамфінпляны. Тут-жа на канфэрэнцыі рабочыя абвясьцілі сябе ўдарнікамі і падалі калектыўную заяву аб уступленьні ў партыю. Усяго паступіла 70 заяў аб уступленьні ў партыю.

* *

Пасьля заключнага слова тав. **Лубуша** і прыняцьця рэзалюцыі па абодвых дакладах, канфэрэнцыя закрылася. Перад закрыцьцём канфэрэнцыі з заключнай прамовай выступіў тав. **Плешакоў, які падагуліў работу канфэрэнцыі.**

Ці так праводзяць спаборніцтва?

Рабочыя фабрыкі імя Сталіна, дайце адказ

Калі паглядзець на лічбы выкананьня вытворчай праграмы па ф-цы імя Сталіна, можа стварыцца ўражаньне, што на фабрыцы ўсё добра. За сьнежань праграма выканана на 101,93 проц., за студзень — на 111,74 проц., за люты — на 105,37, за сакавік — на 114,12 проц.

Але, калі паглядзець на іншыя паказальнікі, то можна ўбачыць зусім іншы малюнак.

Выдатканьне рабочай сілы на адну тону кардону далека перавышае плянавыя меркаваньні. Замест 11 чалавека-дзён у сьнежні 12,22 чалавека-дзён, у студзені — 12,24, у лютым — 12,03 і ў сакавіку — 11,69. **Прастої** таксама перавышаюць плянавыя меркаваньні. Замест 3 проц. прастоі складалі фактычна ў сьнежні 3,97 проц., у студзені — 2,85, у лютым — 5,48 і ў сакавіку — 8,55 проц. Паводле сацдагавору **прагулы** павінны былі быць зусім зьвінчаны. Але фактычна ў сьнежні было 0,16 проц. прагулаў, у лютым — 0,16 і ў сакавіку — 0,04 проц. Але асабліва дрэнная справа з **сабекоштам.** Паводле пляну сабекошт аднэй тоны павінен быў складаць 174 руб., фактычна ў сьнежні тона каштавала 183 руб. 40 к., у студзені — 188 руб. 50 кап., у лютым **—190 руб. 48 кап.,** у сакавіку — 183 р. Між тым, паводле сацдагавору, сабекошт павінен быў быць яшчэ менш 174 руб. —на 1 проц., т. зн. каля 172 руб.

Чым-жа тлумачыць гэтыя прарывы ў якасных паказальніках? Прычыны мы знаходзім у выніках праверкі выкананьня сацдагавору і ўдарніцтва.

Аказваецца, цэхі фабрыкі поўнасьцю ня выканалі ўзятых на сябе абавязкаў. З сац. дагаворам, які быў заключан з падшэфным кустом, рабочыя амаль ня былі азнаёмлены. Выкананьне сацдагавору ня было. Новыя рабочыя ў спаборніцтва ня ўцягваліся. Увага рабочых на асобныя вытворчыя прарывы ня была мабілізавана.

Кіраўніцтва фабкому вызначалася толькі ў скліканьні сходаў. Адміністрацыя ад спаборніцтва стаяла ў баку і не прымала радучых мер для паляпшэньня забясьпячэньня фабрыкі патрэбным сыроцом і тэхнічнымі матар'ялам.

Ударніцкі рух насіў некаторы фармальны характар. Хаця ўдарных брыгад афармлена 13, але, наколькі ня ўсе брыгады былі азнаёмлены з прамфінпляном, наколькі прамфінпляны **ня быў даведзен ня толькі да асобных варштатаў, але нават да асобных цэхаў,** ударныя брыгады ня мелі магчымасьці справіцца з узятымі на сябе абавязкамі.

Кіраўніцтва ўдарніцкім рухам таксама было пастаўлена вельмі дрэнна. Ударнікі ня былі знаёмы з пастановамі першага зьезду ўдарнікаў. Дэлегаты акруговага зьезду ўдарнікаў не зрабілі справаздачы. Уліку работы ўдарных брыгад таксама ня было. Дошкі ўліку сацспаборніцтва не давалі поўнага малюнку ходу сацспа

Праверым тэмпы падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў

Забяспечым поўнае выкананьне дырэктывы партыі аб падрыхтоўцы рабочых, батракоў і беднякоў ва ВНУ і ВТНУ. Рашуча выкарчуем рэшткі бюракратызму і абломаўшчыны ў гэтай важнейшай справе

Шырэй дзьверы школ і ВНУ марксыцка-ленінскаму мэтаду

Стварэньне таварыства пэдагогаў-марксыстых Беларусі—буйны крок на шляху барацьбы за камуністычную школу і выхаваньне новых кадраў

Аб задачах таварыства пэдагогаў-марксыстых

У гэтымі днямі ў Менску стварылася ініцыятыўная група, якая ставіць сваёй мэтай арганізацыю таварыства пэдагогаў - марксыстых Беларусі. Ці спачатку будзе стварэньне такой арганізацыі? Ці будзе яна жыцьцёва? Нам здаецца, што неабходнасьць такой арганізацыі ужо засьведчана тым, што мы па справе абяцаньня марксыцкіх пэдагагічных сіл вельмі спазьніліся.

За апошні час мы маем значнае кажуценьне таварыцкай пэдагагічнай думкі. Пры ўсім ня ўсіх пытаньняў, якія маюць вялікую тэарэтычную цікавасьць і актуальнае значэньне для нашай практыкі, з заходам дыскусіруецца ў асяродзьдзі пэдагогаў - марксыстых. Пытаньне аб прадмеце пэдагогікі, аб яго ўзаемадносінах з іншымі галінамі навукі, аб задачах выхаваньня ў эпоху дыктатуры пралетарыяту, аб узаемадносінах паміж стыхійным і арганізаваным выхаваўчым працэсам, аб разуменьні палітэхнізму — усе гэтыя і рад іншых пытаньняў стаяць зараз у цэнтры ўвагі пэдагогаў - марксыстых.

Нашы беларускія пэдагагічныя кадры, і ў тым ліку нашы пэдагогі - марксысты, у сваёй пераважнай большасьці, трэба проста гата прызнаць, стаяць у баку ад тых спрэчак, якімі жыве пэдагагічная думка, стаяць у баку ад навуковай распрацоўкі пытаньняў пэдагогікі. Яны ня толькі ня прымаюць актыўнага ўдзелу ў абгаварэньні гэтых пытаньняў, а не, што значна горш, многія і ўсім з ім не знаёмы. Занятыя на горла практычнай работай, нашы пэдагогі кідаюць сачыць за развіцьцём тэарэтычнай думкі, і гэта дрэнна адбіваецца на іхняй практычнай рабоце, гэта прыводзіць да таго, што ў гэтай рабоце узмацняецца «рамесьніцтва», кансерватызм, кажасьць, што мы працуем часта зусім механічна, не асмысляючы нашай работы і не насоўваючы таму яе ўперад.

Узбудзіць інтарэс да тэорыі, будзіць тэарэтычную думку ў нашых пэдагогаў — вось першая задача, якая стаіць перад таварыствам пэдагогаў - марксыстых. Выкананьне гэтага зьяўляецца папярэдняй умовай для вырашэньня таварыцкіх асноўных, яго задачы: **барацьбы за пасьлядоўную марксыцкую лінію ў пэдагогіцы, барацьбы з усімі правымі ідэалізму, з усімі правымі механістычнага матэрыялізму, з правымі апартунізму і «культра-лявізны» ў тэорыі пэдагогікі і ў практыцы.**

Таварыства пэдагогаў - марксыстых павінна будзе сканцэнтраваць асноўную увагу на тых пытаньнях, якія маюць актуальнае значэньне для нашай школы. І сярод гэтых пытаньняў першае месца належыць пытаньню аб палітэхнізацыі нашай школы. Над зьместам палітэхнізацыі школы вялася парэшная нарада на пытаньнях народнай асьветы, якая ня тымі днямі скончылася. Пад гэтым лёзунгам павінна ў ближэйшы перыяд праходзіць работа нашага таварыства пэдагогаў - марксыстых. У нас шмат гавораць аб палітэхнізьме, але ў нас вельмі мала разумеюць, што значыць гэтае мудрае слова. Таму нама нічога дзіўнага, што мы да гэтага часу амаль нічога не зрабілі для сапраўднай палітэхнізацыі школы. Задача таварыства заключаецца ў тым, каб самому спачатку абгаварыць пытаньні палітэхнізацыі, дабіцца адзінства ў разуменьні палітэхнізму, а потым ідэі палітэхнізацыі панесьці ў шырокія масы пэдагогаў. Трэба зрабіць так, каб кожнаму настаўніку было ясна, што такое палітэхнізм. Тады, і толькі тады можна будзе патрабаваць ад яго работы ў кірунку палітэхнізацыі.

Таварыстры пэдагогаў - марксыстых ня могуць абмежавацца толькі пастаноўкай пытаньняў тэорыі палітэхнізму. Таварыства павінна вызначыць шляхі да практычнага ажыцьцяўленьня палітэхнізму, яно павінна будзе ўказаць, з чаго пачаць работу, у якім кірунку яе весьці. Без калектыўнай работы над гэтымі пытаньнямі ўсіх пэдагогаў-марксыстых задачы палітэхнізацыі ня вырешыць.

Таварыства пэдагогаў - марксыстых на першых-жа кроках сваёй работы павінна будзе зьвярнуць увагу на рад іншых задач, якія стаяць перад нашай школай, і ў першую чаргу на тыя задачы, якія ўзарышыю высунуты савецкай школай, пры выпрацоўцы якіх нам няма ў каго вучыцца, у якіх мы павінны пракладваць новыя шляхі. Такімі зьяўляюцца задачы грамадзка - палітычнага, анты - рэлігійнага, інтэрнацыянальнага выхаваньня ў нашай школе. Мы маем у гэтай галіне за апошні час значныя посьпехі — гэта бясспрэчна. Але трэба прызнаць, што мы ня дзем работу часта вельмі «топорно», не прыстасоўваемся да разуменьня дзіцяці, што мы яшчэ навукова не распрацавалі мэтаду гэтай работы.

Мы маем у гэтай рабоце рад перагібаў, якія нічога, акрамя шкоды, прынесьці ня могуць. Мы ня можам, напрыклад, ніяк згадзіцца з тымі аўтарамі хрэстаматый, падручнікаў, якія ў мэтах грамадзка - палітычнага выхаваньня напаўняюць свае кнігі, прызначаныя для дзяцей, газэтным матар'ялам, рэзалюцыямі савецкіх і партыйных зьездаў і пленумаў, не апрацоўваючы іх нават такім чынам, каб яны дайшлі да дзіцяці.

Мы ня можам ніяк згадзіцца з тымі, хто лічыць, што кожны прадмет у школе павінен быць паўтарэньнем курсу грамадазнаўства, хто на гэтай падставе, напрыклад, у курс беларускай літаратуры лічыць патрэбным уставіць або зусім бязадарныя, або не падыходзячыя для дзяцей вершы аб індустрыялізацыі і сацыяборніцтве толькі для таго, каб гэтыя моманты знайшлі свой адбітак у праграме. Зразумела, пры выбары твораў таго ці іншага аўтара, мы ў першую чаргу возьмем творы, напісаныя на актуальныя тэмы; але, калі на тую ці іншую тэму мы ня знойдзем мастацкіх і падыходзячых для дзяцей твораў, мы будзем лічыць за лепшае, каб з гэтымі тэмамі яны знаёміліся па падручніку грамадазнаўства, а не па дрэнных вершах. Бо выкладаньне літаратуры ў школе мае спэцыфічныя задачы і зусім не павінна дубліваць курсу грамадазнаўства.

І, нарэшце, у парадку самакрытыкі ніхай будзе сказана, інакш, як «левым» загібам, нельга назваць, калі збіраюць са школы падручнік арытмэтыкі таму, што ў ім не знайшлі поўнага адлюстраваньня працэсы калектывізацыі, не замяняючы яго другім, і такім чынам пакідаючы школы зусім без падручніка па арытмэтыцы. Мы маглі-б прывесьці яшчэ дзесяткі такіх фактаў, да гэтага пытаньня, якое мае вялізарнае значэньне, мы вернемся ў асобным артыкуле, — але і прыведзенага вышэй давоі, каб пераканацца ў тым, што перад таварыствам пэдагогаў - марксыстых стаіць важнейшая задача знайсьці мэтады грамадзка-палітычнага выхаваньня ў школе, мэтады, якія адпавядалі-б разуменьню дзіцяці, мэтады, якія далі-б максымальны эфэкт. Мы чакаем ад таварыства пэдагогаў-марксыстых, што яно таксама дапаможа вызначыць месца і спэцыфічныя задачы кожнага прадмету ў школе (2-га канцэнтру).

Таварыства пэдагогаў - марксыстых павінна будзе адыграць вялікую ролю і адыграе яе, калі яно не замкнецца ў вузкім коле, калі яно ня будзе варыцца ў сваім уласным саку, калі яно правецца да шырокіх мас пэдагогаў. Было-б вялізарнай памылкай, калі-б таварыства паставіла сваёй задачай аб'яднаць толькі марксыстых - тэарэтыкаў пэдагогікі. Такіх людзей у нас лёгка пералічыць па пальцах адной рукі, і ў такім складзе таварыства працаздольным быць ня можа. Яно павінна аб'яднаць у сваіх радох і практыкаў - пэдагогаў, пэдолёгаў, мэтадыстых, якія стаяць на цэнтрэ погляду дыялектычнага матэрыялізму і ў сваёй практычнай рабоце праводзяць лінію нашай партыі.

Зразумела, кола сапраўдных членаў таварыства ня зможа быць вельмі шырокім. Марксыстымі мы можам называць толькі тых людзей, якія цалкам і поўнасьцю ўспрынялі марксысцка-ленінскае вучэньне, якія ўжываюць марксыцкі мэтад у сваіх навуковых працах і ў практыцы, якія змагаюцца з усімі ўхіламі ад марксызму і ленінізму. Такіх пэдагогаў у нас нямнога. Але таварыства, якое аб'яднае ў сваіх радох перадавую і лепшую частку пэдагогаў, павінна зацікавіць сваёй работай і ўцягнуць у яе і тых пэдагогаў, якія імкнуцца аўладаць марксызмам, якія хочуць стаць марксыстымі. Такіх у нас значна больш, і яны павінны быць на тых ці іншых пачатках уцягнуты ў работу таварыства. Дапамагчы пэдагогам, якія жадаюць стаць марксыстымі, стаць такімі на справе — вось адна з задач, якая стаіць перад таварыствам.

У таварыстве пэдагогаў - марксыстых ёсьць вялізарная патрэбнасьць. І ў гэтым гарантыя таго, што яно будзе жыцьцёва. Трэба толькі, каб удзельнікі гэтага таварыства, перагружаныя практычнай работай, урвалі-б частку на актыўную работу ў таварыстве, і тады мы ўпэўнены, што таварыства пэдагогаў-марксыстых Беларусі стане адным з важных фактараў культурнай рэвалюцыі на Беларусі і зойме не апошняе месца ў радзе падобных таварыстваў, арганізаваных у іншых саюзных рэспубліках.

Е. РЫЎЛІН.

Ці забясьпечана адчыненьне ў тэрмін ВТНУ ў Менску?

Праз 3-4 месяцы павінна разгарнуць сваю працу тэхнічная ВНУ, што адкрываецца ў Менску.

Аднак, да гэтага дня яшчэ ня выяўлены арганізацыйныя формы і вытворчая ўстаноўка гэтае навучальнае ўстановы. Прынамсі, савецкая грамадзкасьць аб гэтым вельмі мала інфармавана: дзьве-тры кароценькія заметкі, як кажуць, у два радкі. На падставе гэтых заметак зусім нельга было ўявіць, каго будзе выпускаць ВТНУ: інжынераў-арганізатараў, ці вузкіх спэцыялістых з 4-х або 3-хгадзінім тэрмінам навучаньня, на якой матар'яльнай базе і з якім прафэсарскім складам і г. д.? Толькі 26 красавіка ў газэце «Рабочай» была зьмешчана заметка аб тым, што СНК БССР прапанаваў ВСНГБ і Наркамасьветы тэрмінова распачаць арганізацыю лябараторый, габінэтаў і бібліятэкі інстытуту (гэта за 3 месяцы да адчыненьня).

Між тым, рад калектываў, зацікаўленых інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў, трэстаў і прадпрыемстваў гор. Менску (як ВЭС, заводаў «Энэргія» і «Камунар», Менбуду і іншых) па спэцыяльна скліканых сходах вынесьлі пастанову аб неабходнасьці, побач з адчыненьнем дзеннага ВТНУ, адчыніць таксама і **вячэрні**. Удзельнікі гэтых сходаў лічылі патрэбным адкрыць такую вячэрнюю **ВТНУ** спэцыяльна для **асоб з сярэдняй і нясканчанай вышэйшай тэхнічнай асьветай** з тым, каб, не адрываючы іх ад вытворчасьці, на **працягу 2-х год** падрыхтаваць з іх інжынэраў.

Гэтае мерапрыемства тым больш рэальна, што гэтыя таварышы не адчуваюць патрэбы ў рабінэтах і лябараторыях так, як нова-паступаючыя. Яны маюць ужо салідны вытворчы стаж на заводах і будаўніцтве. Гэтай катэгорыі студэнтаў патрэбна толькі поўная тэарытычная дападрыхтоўка, што і адпавядае магчымасьцям маладой ВТНУ. Бо, бясспрэчна, што першыя гады яна яшчэ ня будзе мець належным чынам абсталяваных лябараторый, ні габінэтаў, ні майстэрань.

Пратаколы вышэйпаказаных сходаў былі пасланы ўсім зацікаўленым органам з просьбай падзяліцца праз друк сваёй думкай па ўзьнятым пытаньні. Аднак, да сёнешняга дня гэтыя арганізацыі (ВСНГБ, Наркамасьветы, ЦСПСБ) не патурбаваліся што-небудзь паведаміць.

Закранутае тут пытаньне мае вялікае значэньне для Беларусі і на пікодзіла-б, каму належыць, пацікавіцца, наколькі падрыхтоўчая работа да адкрыцьця ВТНУ забясьпечвае рэальнае адчыненьне гэтага пачынаньня.

Л. ШУМАХЭР.

Ад рэдакцыі: Чакаем адказу органаў ВСНГБ і Наркамасьветы па закранутых у артыкуле пытаньнях, у прыватнасьці, аб магчаснасьці адчыненьня вячэрняй ВТНУ.

Сыгналы з фронту падрыхтоўкі кадраў

(Паводле допісаў рабселькораў)

Праблема кадраў зьяўляецца цэнтральнай праблемай сёнешняга дня. Так ацэньвае гэту задачу партыя. У разалюцыі лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) сказана: «Размах падрыхтоўкі кадраў, пачынаючы ад інжынэра і канчаючы кваліфікаваным рабочым, павінен адпавядаць агульнаму размаху сацыялістычнага будаўніцтва». Зрывы тэмпаў у падрыхтоўцы спэцыялістых награжаюць зрывам тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Тут мы даем месца сыгналам рабселькораў аб прарывах і недахопах на фронце падрыхтоўкі кадраў.

ПРАРЫВЫ Ў ГОМЕЛЬСКІМ ПЭДТЭХНІКУМЕ

Рэдакцыя атрымала ліст за подпісамі групы студэнтаў тэхнікуму, з якога відаць, што падрыхтоўка чырвоных пэдагогаў у тэхнікуме пастаўлена зусім дрэнна. За першае паўгодзьдзе студэнтамі пэдагагічнага тэхнікуму працуцчана 11.320 лекцый, што складае на кожнага студэнта каля 40 лекцый. Пасьпяховасьць па грамадазнаўчых дысцыплінах складае 50-60 проц. Сярод студэнцтва не адчуваецца ўдарніцтва, не адчуваецца сацыялістычных тэмпаў падрыхтоўкі. У галіне ідэалёгічнага выхаваньня студэнтаў справа яшчэ горшая. Вось некалькі прыкладаў. Выкладчык грамадазнаўчых дысцыплін на 4-м курсе (ён-жа і дырэктар тэхнікуму) т. Слуцкі пры распрацоўцы настаноў лістападаўскага пленуму тлумачыць, што «кулака пасьля раскулачваньня можна прымаць на завод рабочым». Такая «ўстаноўка» давалася студэнтам, якія едуць на вёску. Сярод часткі студэнтаў налядаюцца яўна кулацкія настроі. Так, студэнт 4-га курсу Новікаў плача аб тым, што «кулака прыцісьнулі», а студэнт з курсу Рудкоўскі на запытаньне «ці раіць ён уступаць у калгас, адказаў: «калі захацеў пастаяць у чарзе, дык чаму-ж, уступай» і г. д. Выкладаньне мэтодыкі палітасьветпрацы, чытаньне дакладаў на сучасныя тэмы фактычна зманана. Выкладчык гэтае дысцыпліны, даючы практычную працу студэнтам, не знайшоў іншае тэмы, як напісаньне заявы... аб спатнаньні алімэнтаў.

Другі допіс студэнта - партыйца пацьвярджае дрэннае становішча навучальнай працы ў тэхнікуме. Назіраецца аналітычнасьць часткі пастаўшчыка да грамадзкага жыцьця. З 22 пастаўнікаў толькі тры пастаянна працуюць у тэхнікуме, адсюль—сыстэматычныя спазьненьні пастаўнікаў на лекцыі, а часта і зрыў заняткаў. Нарэшце, трэба праверыць становішча ў Гомельскім пэдтэхнікуме.

ПАД ПАГРОЗАЮ ЗРЫВУ

знаходзяцца 8-мімесячныя курсы на падрыхтоўцы рабочых у ВНУ,—піша курсант гомельскіх курсаў. Прычынай зрыву зьяўляюцца несваячасовыя меры да таго, каб курсанты-рабочыя былі пераведзены на дзенную зьмену. Праф. і парт. арганізацыі не прынялі ніякіх захадаў для таго, каб стварыць патрэбныя ўмовы для вучобы (вызваленьне курсантаў ад нагрузкі і інш.). Праз гэта з прынятых на курсы 120 слухачоў цяпер фактычна працуе 65. Калі ня прыняць цяпер патрэбных захадаў, магчыма, што адсеў курсантаў будзе яшчэ большы. Прафэсыянальным і партыйным арганізацыям Гомелю трэба бездакладна зацікавіцца гэтым пытаньнем.

ДАЙЦЕ ДОБРЫЯ ПАДРУЧНІКІ

З такім занатрабаваньнем зварачаецца курсант Гомельскай саўпартшколы, які ў сваім лісьце піша, што для заняткаў зусім няма адпаведных падручнікаў. Літаратура, па якой курсанты вывучаюць агратэхніку і зоатэхніку, выданьня... часоў Сталыпіна. Курсанты чакаюць падручніка, які будзе адпавядаць запатрабаваньням сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гасьпадаркі.

КУРСЫ ШОФЭРАЎ... БЕЗ АЎТАМАБІЛЯ

Менская 6-месячная школа па падрыхтоўцы шофэраў пры НКТ б'е трывогу. Школа ўжо займаецца тры месяцы і за гэты нэрыяд часу праходзяць толькі тэорыю. Да практычнай-жа вучобы—язды —з-за адсутнасьці машын да гэтага часу яшчэ не прыступілі. У школе ёсьць тры старадаўнія аўто, якія ўвесь час стаяць у рамонце. Гэта стварае пагрозу зрыву заняткаў. Цяпер больш, чым раней, адчуваецца востая патрэба ў шофэрах, падрыхтоўка якіх такім тэмпам, як яна праводзіцца ў паказанай школе зьяўляецца злачыннай.

Бездартранс павінен задаволіць заяўку школы на патрэбную колькасьць аўтамабілёй пры першай магчымасьці.

ДАКУТОВІЧ.

За высокую якасьць прадукцыі

„Прафінтэрн" выпускае дрэнную прадукцыю

ЦП саюзу друкароў учора атрымаў скаргу ад Гомельскай картаажна-мяшочкавай фабрыкі імя Клары Цэткін аб дрэннай якасьці паперы, якую фабрыка атрымлівае ад Барысаўскай фабрыкі **«Прафінтэрн»**.

Спэцыяльная камісія, якая абсьледавала дзьве партыі паперы, атрыманай ад фабрыкі «Прафінтэрн», колькасьцю ў **22.000 клм.**, устанавіла, што ў першай партыі матавай паперы ёсьць **нэля 20 проц. браку, а** ў другой партыі глянцаванай паперы—**каля 10 проц. браку.**

Матавая папера для мяшочкавай вытворчасьці зусім не надаецца. Папершае, пры змазваньні мяшочкаў крухмальным клеем, гэтая папера распаўзецца, мяшочак не высыхае, папера гніе і расклейваецца. Падругое, з прычыны таго, што такая папера амаль не згінаецца, а ламаецца, прадукцыянасьць працы ніжэй звычайнай, у работніц сьціраецца скура з рук, што выклікае рост захворваньняў. Прадукцыянасьць працы ў красавіку ў параўнаньні з сакавіком зьнізілася **на 25 проц.**

З красавіка фабрыка «Прафінтэрн» пачала адгружаць паперу не абрэзаную, з разарванымі краямі. Такую паперу раней, чым пусьціць у работу прыходзіцца абрэзаць, што дае **10 проц. браку.** Гэта таксама адбіваецца на стандарце мяшочкаў.

У адной і тэй-жа кіпе паперы ёсьць розныя разьмеры лістоў. Пры машыннай рэзцы паперы, атрымліваюцца лісты рознага разьмеру, што дае не аднолькавы разьмер мяшочкаў. Гэта таксама павялічвае брак прыблізна **на 5 проц.**

Апрача таго, у кіпах паперы трапляюцца парваныя лісты, кавалкі, у частцы лістоў ёсьць дзіркі ад кавалкаў дзерава, каменнага вугалю і г. д., што таксама павялічвае брак і часта раніць рукі работніцам.

Аб усіх гэтых дэфэктах фабрыка імя Клары Цэткін **ня раз паведамляла фабрыку «Прафінтэрн».** Але апошняя ня толькі не паляпшае якасьці сваёй прадукцыі, але наадварот—**пагаршае.** Заказчыкі фабрыкі імя Клары Цэткін, галоўным чынам **каапэрацыя**, часта скардзіцца на дрэнную якасьць мяшочкаў.

Мы ведаем, што фабрыка «Прафінтэрн» добра спраўляецца са сваімі вытворчымі заданьнямі. Вытворчая праграма выконваецца. Але вось аказваецца, што фабрыка «Прафінтэрн» **гэняючыся за колькасьцю зусім забыла аб якасьці сваёй прадукцыі.**

Рабочыя фабрыкі «Прафінтэрн», удзельнікі сацспаборніцтва, ударнікі— павінны разгарнуць энэргічную работу па паляпшэньні якасьці прадукцыі. Перавыкананьне колькасных паказальнікаў—гэта толькі **частка** выкананьня прамфінпляну. Прарыў у выкананьні якасных паказальнікаў—**самы гэнебны прарыў.**

В.

Не работа, а гора

Віцебская абутковая фабрыка імя Лекерта ў апошні час пачала выраблять каляровы абутак з жоўтай конскай скуры. З прычыны вельмі дрэннай апрацоўкі скуры Віцебскай гарбарняй атрымлівецца вялікая колькасьць браку і кепскай якасьці абутак. У той час, як пры карыстаньні звычайным хромам на пару туфель ідзе толькі 1½ фута скуры, пры карыстаньні конскай скуры затрачваецца 2½ футы. Пасьля раскрою застаюцца вялікія кавалкі, якія ўжо нельга выкарыстаць.. У зацяжным і рантавым цэхах загатоўкі пры нацяжцы рвуцца, як папера. А пры здыманьні з калодак абутак ломіцца. Такіх папсаваных **ботаў і туфель сабралася звыш 5.000 шт.** і з кожным днём колькасьць браку павялічваецца.

Апрача таго, у закройны цэх прыносяць штодзённа з запяжнога і рантавога цэхаў па 100-150 пар загатовак з парванымі наскамі і саюзкамі, што парушае нармальны ход работы.

Усё гэта павялічвае сабекошт кожнай пары абутку **на 1 руб.**

Чаму-ж Віцебская гарбарня выпрацоўвае такую дрэнную скуру? Няўжо нельга дабіцца, каб скура выходзіла не гарэлай, перасушанай, што зьяўляецца асноўнай прычынай вялікай колькасьці браку пры не апрацоўцы? Няхай на гэта адкажуць рабочыя Віцебскай гарбарні.

М. СКАРАХОДАЎ.

Лепельскія „майстры"

Лепельскія шавецкая і кравецкая саматужна-прамысловыя арцелі працуюць зусім дрэнна. Шавецкая арцель часта выпускае боты з фанэрнай падэшвай. Кравецкая майстэрня зімой пошла такія шапкі, якія распаўзаліся на другі-ж дзень. Частка гэтых шапак была вернута спажыўцамі і перадана каапэрацыі на пераробку прыватніку.

Зараз кравецкая майстэрня зрабіла для спажывецкай каапэрацыі вялікую партыю планчоў. Апошнія пашыты з вельмі добрага матар'ялу, але работа — нікуды ня вартая. Рубцы не апрацаваны, а таму матэрыя высыпаецца. Рукавы ў планчох зроблены з кавалку розпага колеру.

Арцелі атрымліваюць матар'ял высокай якасьці. Трэба перад імі паставіць пытаньне — паляпшыць якасьць работы.

БАРАНЬ.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Разгортваючы бальшавіцкую самакрытыку, узмацняючы барацьбу з правым і „левым" апартунізмам,—Мазырская арганізацыя павінна хутка і рашуча выправіць свае памылкі

Аб прарывах у рабоце Мазырскай арганізацыі

Даведка. 92,7 проц. насельніцтва **Мазыршчыны** занята сельскай гаспадаркай і толькі 0,7 проц. занята ў прамысловасьці акругі. У акрузе на кожныя 100 чалавек ёсьць усяго 30 пісьменных.

Нашаму ЦК за час з 12-га зьезду КП(б)Б ня раз прыходзілася зайняцца значным Мазырскай партарганізацыі (Тураўская справа, справа **Сасноўскага**). З гэтых фактаў некаторыя робяць вывад, што Мазырская арганізацыя—цяжка хворы арганізм. Гэта няверна. Хаця яшчэ мы і будзем гаварыць аб прарывах, але трэба папярэдзіць, што Мазырская арганізацыя у асноўным здаровая; яна вядзе рашучую барацьбу з левымі ухілам, яна абараняе генэральную лінію партыі, яна змагаецца за свае недахопы, са сваімі памылкамі.

Наколькі партыйная арганізацыя здолела сканцэнтраваць сваю ўвагу на вырашэньні асноўных гаспадарчых праблем акругі? Мазырскі АК ня здолеў рашуча настаяць і адпавальнячэ вырашыць два варгавальныя пытаньні гаспадарчага будаўніцтва Мазыршчыны — пытаньні **жывёлагадоўлі і лесазагатовак.** У 1929 годзе стада ня ўзмацнілася, а ў 1930 годзе колькасьць скаціны зьменшылася на 25 проц. Гэта зьяўляецца вынікам кулацкай агітацыі і перагібаў у калгасным будаўніцтве акругі. Пытаньні жывёлагадоўлі за апошні год амаль не стаялі ў парадку дня работы акруговай і ўсёй арганізацыі. Мазырская акруговая кіраўніцтва недаацаніла значэньня жывёлагадоўлі.

Мазырская арганізацыя ня здолела выканаць 100-проц. выкананьня плану лесазагатовак. У 1928-29 г. акруга выканала толькі 62 проц. заданьня па лесазагатовках. У 1929-30 г. заданьне таксама ня будзе выканана. Вывезена ўсяго 50 проц. будаўнічага лесу. Акруговым аддзелам лесагатовак недастаткова ўвагу ўсім лесазагатовак. Вакол гэтых пытаньняў ня былі мабілізаваны партыйныя, рабочыя, батрацкія і бяднацка-сераднацкія масы. Гэта—другі мінус у рабоце Мазырскай арганізацыі.

Калектывізацыя. На 1 кастрычніка 1929 году было калектывізавана 7,8 проц. дворов, на 1 студзеня 1930 г.—34 проц., на 20 лютага—52 проц., а на 15 красавіка засталося толькі 20 проц. Наклёнам Мазырскую арганізацыю будзе цьвердзіць, што ўсе 34 проц. гаспадарак, якія ўвайшлі ў калгасы да 1-га студзеня, былі заняты туды мэтадамі прымусу. Хаця ў калгасы пасьля 15 проц. будзе таксама, што ўсе калектывізаваныя двароў, увайшоўшых у калгасы да 1-га студзеня, таксама былі на прымусова. Беднота, асераднякоў пайшлі ў калгасы. Бяда кіраўніцтва Мазырскай арганізацыі заключаецца ў тым, што ня будзе гаварыць галава ад посьпехаў, што ня ўзьявілася трубую памылку, паратавіваць ва што-б там ні стала ўсе 100 проц. бяднацка-сераднацкіх гаспадарак да вясны 1930 году.

Вось, напрыклад, што пастанаўў Казатковіцкі РК КП(б)Б 10 лютага 1930 г. «У сувязі з тым, што на 10 лютага калектывізавана 83 проц. усіх гаспадарак, прапанаваць усім ячэйкам і работнікам па калектывізацыі дабіцца ўцягненьня ў калгасы да 20 лютага рэшты—17 проц. двароў, якія яшчэ не ўвайшлі ў калгасы». Гэты прыклад характарызуе настрої на мясцох. Мазырскі АК з свайго боку нават арганізаваў спаборніцтва на колькасьць калектывізаваных гаспадарак у мінімальны тэрмін. Спаборніцтва праводзілася таксама і ў пытаньнях якасьці калектывізацыі, але-ж пад якасьцю разумелася (і праводзілася) 100-процантнае абагуленьне ўсёй жывёлы, падсобных заработкаў і будынкаў. 20 проц. калектывізаваных гаспадарак—гэта рэзультат шматлікіх скажэньняў партыйнай лініі, дапушчаных пры правядзеньні калектывізацыі на Мазыршчыне. На мясцох у радзе выпадкаў дапускалі адміністрацыйны націск. Перагібы знайшлі сваё адлюстраваньне і ў фактычным курсе на арганізацыю камун.

Перагібы — асноўная прычына адліву з калгасаў Мазыршчыны. Аднак, быў цэлы рад і іншых прычын, якія выклікалі гэты адліў. Да гэтых прычын трэба адносіць безгасадарчасьць новаарганізаваных калгасаў і рад труднасьцей, зьвязаных з першым перыядам існаваньня калгасаў. Бясспрэчна, крыніцаю гэтых труднасьцей зьявілася адсутнасьць патрэбнага кіраўніцтва калгасамі.

Невыстарчальны адпор шалёнай барацьбе кулацтва і іншых клясава-варожых элемэнтаў супроць калектывізацыі таксама зьявіўся адной з важнейшых прычын адліву з калгасаў. Кулак скарыстаў дапушчаныя памылкі, асабліва перагібы для таго, каб разлажыць калгасы з сярэдзіны. Кулаку тым лягчэй было весьці сваю разбуральную работу, чым слабей была арганізавана беднота, чым менш быў замацаваны саюз сераднякоў унутры калгасу, а бедната ў калгасах была арганізавана слаба, сераднячка часта адхілялі ад кіраўніцтва ў калгасе. Былі дапушчаны сур'ёзныя памылкі ў закрыцьці цэркваў.

14-га студзеня Мазырскі АК рашуча ўдарыў па Пятрыкоўскім парткіраўніцтве за перагібы і скажэньні партыйнай лініі. Некалькі чалавек было выключана з партыі. 23-га студзеня пленум АК заваструў увагу на барацьбе з перагібамі. Гэта сьведчыць аб тым, што Мазырскі АК лічыць барацьбу з перагібамі. Але ўся бяда заключаецца ў тым, што Мазырскі АК гэту барацьбу праводзіў невыстарчальна, не даволі рашуча і энэргічна. Пералом у рабоце арчальная рашучасьць у барацьбе з перагібамі толькі спрыяла адліву з калгасаў.

Мазырскі АК зусім не выстарчальна цікавіўся індывідуальным сэктарам сельскай гаспадаркі. Трэба падкрэсьліць невыстарчальнасьць і несвоячасовасьць вытворчай дапамогі бяднацкім гаспадаркам.

20 проц. калектывізаваных гаспадарак —гэта вялікае дасягненьне. Аднак, вышэйпаданы факты з усёй выразнасьцю сьведчаць, што Мазырская арганізацыя ня здолела стаць на чале калгаснага руху. Мазырскі АК у спэцыяльнай рэзалюцыі прызнаў свае памылкі. Трэба адзначыць, што ён за апошні час дабіўся дасягненьняў у мабілізацыі партыйнай масы на барацьбу з перагібамі за бальшавіцкае правядзеньне сяўбы.

У Мазырскай арганізацыі маюць месца шматлікія факты ігнараваньня дырэктыў партыі аб рабоце з беднатой. Групы беднаты пры сельсаветах, КСУ, каапэрацыі, як правіла, не вядуць сыстэматычнай работы. У калгасах у самы разгар калгаснага руху ня было батрацка-бяднацкіх груп. Пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб рабоце з беднатой у арганізацыі не прапрацаваны. У акрузе прыміркча адносіліся да тых, хто праводзіў праваапартуністычную лінію ў пытаньнях работы сярод беднаты.

У акрузе за апошні год мелі месца ў асобных раёнах сур'ёзныя антысераднацкія перагібы. Пры правядзеньні калектывізацыі ў акрузе было раскулачана каля 300 сераднякоў. Буйнейшая памылкай Мазырскай арганізацыі зьяўляецца невыстарчальная барацьба з гэтымі перагібамі і тое, што ў арганізацыі ня была даволі глыбока выкрыта кулацкая, контр-рэвалюцыйная трацкіцкая сутнасьць гэтых антысераднацкіх перагібаў.

Ацэньваючы работу арганізацыі, нельга абыйсьці такога кардынальнага дэфакту ў яе рабоце, як дрэннае кіраўніцтва з боку АК і РК прадпрыемствамі, прафсаюзамі і рабочымі ячэйкамі. На прадпрыемствах акругі маюць месца буйныя прарывы.

Слабасьць работы з беднатой і батрацтвам, дрэннае кіраўніцтва прадпрыемствамі і вытворчымі ячэйкамі прыводзяць да таго, што рад зьвеньняў партыйнай арганізацыі паслабляе свой адпор націску на іх кулацка-нэпманскіх і мяшчанска-абывательскіх элемэнтаў. У сувязі з гэтым мы маем у арганізацыі рад праваапартуністычных скажэньняў, вылазак яўрэйскага шавінізму і г. д. Барацьба з правымі правага ўхілу на практыцы праводзілася не заўсёды даволі рашуча.

У Мазырскай арганізацыі асабліва хваранітэ адчуваецца адсутнасьць самакрытыкі, яе малая дзейнасьць. Абывательская, клясава-варожая «самакрытыка» была часамі куды большай, і невыпадкова, што абывательская самакрытыка перамагла пры ацэнцы вынікаў чыстки гарадзкой арганізацыі. Мазырская арганізацыя не дала рашучага адпору ўсім клясава-варожым і незадаволеным чысткай элемэнтам, якія скарысталі асобныя буйныя недахопы пры чыстцы гарадзкой арганізацыі для ня кампрамэтацыі.

Мазыршчына, пазбаўленая моцнай пралетарскай базы, адчувае патрэбнасьць у сыстэматычнай дапамозе з боку цэнтральных арганізацый. Асабліва хваранітэ адчуваецца недахват кадраў. Трэба ўзмацніць пралетарскае ядро ў кіраўнічых кадрах Мазыршчыны.

А. ТАНХІЛЕВІЧ.

Аб становішчы і рабоце Мазырскай партарганізацыі

З рэзалюцыі бюро ЦК КП(б)Б

Заслухаўшы даклад аб становішчы і рабоце **Мазырскай** арганізацыі, бюро ЦК адзначыла, што ў партыйнай арганізацыі ёсьць рад карэнных недахопаў, з якіх асноўнымі зьяўляюцца:

а) Наяўнасьць раду палітычных памылак і грубых скажэньняў лініі партыі пры правядзеньні калектывізацыі (курс на 100-процантную калектывізацыю да весьнавой пасеўнай кампаніі 1930 г., спаборніцтва на колькасьць калгасаў, групы адміністрацыйны націск, перакананьне ў камуну), хаця АК і пераключыў сваю ўвагу на барацьбу са скрыўленьнямі партыйнай лініі і выпраўленьне палітычных памылак, аднак, не праводзіў гэтай барацьбы даволі рашуча і жорстка;

б) Ігнараваньне ў радзе месц дырэктыў партыі аб сыстэматычнай рабоце на арганізацыі беднаты і пастаноўцы работы батрацка-бяднацкіх груп у калгасах і нездавальняючая барацьба АК з праваапартуністычнай недаацэнкай работы сярод беднаты ў Мазырскай партарганізацыі;

в) Мазырскі АК не даволі рашуча змагаўся і выкрываў кулацкую і апартуністычную сутнасьць анты-сераднацкіх перагібаў, якія былі ў Мазырскай акрузе пры правядзеньні хлеба і бульбазагатовак і асабліва пры арганізацыі калгасаў і пры раскулачваньні;

г) Бюро ЦК канстатуе невыстарчальную ўвагу АК да важнейшых гаспадарчых пытаньняў, асабліва недапушчальным зьяўляецца адсутнасьць кіраўніцтва пытаньнем разьвіцьця жывёлагадоўлі, у галіне якой заўважваецца адставаньне і нават значнае зьмяншэньне стада за апошні год;

д) Наяўнасьць раду буйных недахопаў у справе падрыхтоўкі да весьнавой пасеўнай кампаніі, асабліва сярод індывідуальных бяднацка-сераднацкіх гаспадарак;

е) Недаацэнка палітычнага значэньня лесазагатовак і дрэнная мабілізацыя мас вакол пытаньняў выкананьня заданьняў па лесазагатоўках і прамфінпляну прамысловасьці цалкам, асабліва лічыць недапушчальным невыкананьне заданьняў па экспарце;

ж) Адным з асноўных недахопаў зьяўляецца слабае паліт

ЛІСТОК РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ІНСПЭКЦЫІ

ШТАБ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ НА ПРАВЕРЦЫ

Бясплянавасьць, сямейнасьць, безадказнасьць за даручаную справу, нежаданьне працаваць пановаму--вось, што перашкаджае выкананьню прамфінпляну

АБВЕСЬЦІМ ВАЙНУ БЯСЬПЕЧНАСЬЦІ І НЯДБАЙСТВУ, АЗДАРОВІМ І АРАБОЧЫМ АПАРАТЫ ВСНГБ І ТРЭСТАУ

Адарваны ад жыцьця і прадпрыемстваў

Бліжайшае азнаямленьне рабочай брыгады з работай групы мясцовай прамысловасьці ВСНГБ высьветліла, што гэты вучастак працы ВСНГ БССР культае на ўсе чатыры нагі.

Група мясцовай прамысловасьці ня толькі не кіравала прамысловасьцю, але часамі нават і перашкаджала рабоце на мясцох. Унутры самой групы адсутнічае выразнае разьмеркаваньне функцый паміж асобнымі працаўнікамі. Частка апарату групы не адпавядае свайму прызначэньню. Напрыклад, на тав. Жураўлёва ўскладзена інструктаваньне складаньнем балянсаў і іншых справаздачных матар'ялаў. Не гаворачы аб недастатковай падрыхтаванасьці экананістага Жураўлёва да гэтай працы, ён, з прычыны адсутнасьці цьвёрдага пляну работы, на працягу году толькі 2 месяцы займаўся сваёй непасрэднай справай, а рэшту часу выконваў розную працу, даволі часта тэхнічную, якая магла выконвацца рахункаводам.

Мэтады дапамогі групы акруговым інспэкцыям заслугоўваюць асаблівай увагі. Менская акруговая інспэкцыя прыслала ў ВСНГБ даклад аб неабходных зьменах у настаноўцы вучоту. Некалькі раз супрацоўнік інспэкцыі тав. Азар прыходзіў у ВСНГБ для выраішэньня падпятага ім-жа вельмі важнага пытаньня, але група ўсё адмаўлялася ад разгляду, спасылаючыся на адсутнасьць часу. Рантам Менская інспэкцыя атрымлівае ад групы ВСНГБ пратакол нарады, у якой бышам браў удзел тав. Азар (фактычна-ж ніякага ўдзелу ў гэтай нарадзе ён ня браў). Група мясц. прам. ВСНГБ высоўваецца рад прапаноў аб паляпшэньні вучоту. Вось добрае і ініцыятыўнае кіраўніцтва. Але калі параўнаць зьмест пратаколу з пратаколамі тав. Азара, дык яны поўнасьцю супадаюць. Такім чынам, мы маем тут не кіраўніцтва, а «очковтирательство».

Шмат справаздачнага матар'ялу, які атрымліваецца з месц, групай не вывучаецца, а мэханічна зводзіцца, прычым з значным спазьненьнем. Напрыклад, справаздача за 27-28 г. складзена групай праз 11 мес. пасьля сканчэньня году, а пра справаздачу за 28-29 г. група мясцовай прамысловасьці нават яшчэ і ня думае.

Такое важнае пытаньне, як уплыў на мясцовую і саматужную прамысловасьць прыватніка і сувязь з апошнім, групай не вывучаецца. Усе справаздачныя і плянавыя формы пабудаваны так, што на гэтае пытаньне няма адказу. Наогул ніякіх паказаньняў у гэтым пытаньні група не давала і ім зусім ня цікавілася.

Аб бюракратызьме і цяганіне ў групе мясцовай прамысловасьці сьведчыць наступны факт, які можа быць кваліфікаваны, як шкодніцтва. Менская лямпавая фабрыка на працягу 3-х месяцаў не атрымлівала шэрсьці, з-за гэтага фабрыка працавала са значнай недагрузкай і нават была пагроза спыненьня з-за адсутнасьці сырцу. Сур'ёзнае становішча прымусіла дырэктара фабрыкі выехаць у Маскву ў ВСНГ СССР, дзе ён даведваецца, што паводле разгляду фабрыка поўнасьцю задаволена сырцом і што ВСНГ БССР аб гэтым мае адпаведнае паведамленьне больш двух месяцаў. Гэты вельмі важны дакумант аб разьмеркаваньні сырцу, замест таго, каб быць накіраваным тым прадпрыемствам, якія павінны былі на падставе яго стварыць умовы па забесьпячэньні, без усякага выкананьня групай прышываецца да справы. Група мясцовай прамысловасьці важна, каб паперы былі ў справах, а што такія ўчынкі зрываюць выкананьне прамфінпляну, гэта, мабыць, групы не датычыць.

Між іншым, трэба адзначыць, што падначаленая групе Менская акруговая інспэкцыя мясцовай прамысловасьці сьлімі мэтадамі недалёка адыйшла ад свайго кіраўніка — групы мясцовай прамысловасьці ВСНГ БССР. Уся работа Менскай акруговай інспэкцыі праходзіць выключна ў канцылярыях, адарвана ад прадпрыемстваў.

Рабочая брыгада спадзяецца, што камісія па чыстцы вызваліць групу мясцовай прамысловасьці ад непрацездольных людзей і зробіць яе работу больш выразнай і жыцьцёвай.

РАБОЧАЯ БРЫГАДА.

Вынікі чысткі менскага калектыву абаронцаў

Скончыла сваю работу камісія па чыстцы менскага калектыву абаронцаў. Камісія ў сваіх вывадах адзначыла рад станоўчых бакоў у рабоце калектыву абаронцаў у сувязі з пераходам на новы мэтад работы. Пашырылася юрыдычнае абслугоўваньне працоўнага насельніцтва. Калегія абаронцаў пасылала сваіх прадстаўнікоў для кансультацыі па буйных прадпрыемствах, у РСІ і г. д.

Побач з гэтым камісія адзначыла слабую расправоўку пытаньня аб кадрах. Адзначаны выпадкі, калі некаторыя абаронцы ўзбудзілі неабгрунтаваныя хадайніцтвы, каб адцягнуць судовы працэс. Нацыянальныя судовыя камэры не заўсёды абслугоўваліся на роднай мове. Камісія настанавіла аб'яднаць прэзыдыум калегіі абаронцаў з праўленьнем калектыву, рэарганізаваць мэтады аплаты працы.

Выключаны з складу калектыву **Бялінскі** (сацыяльна-чужы элемэнт, судзіўся за мані-ньніцтва) і **Шпакоў** — за утойваньне свайго сацыяльнага паходжэньня. Апрача таго некалькім правааборонцам зроблена вымова і пастаўлена на від. Некаторым абаронцам прапанавана ўзьняць сваё палітычнае разьвіцьцё і павялічыць нагрузку па грамадзкай рабоце.

ЛЮДЗІ СТАРЫХ ТЭМПАЎ

Электрыфікацыя — асноўная тэхнічная база індустрыялізацыі нашай гаспадаркі. Ад яе тэмпаў залежыць у значнай меры ажыцьцяўленьне генэральных задач, пастаўленых партыяй і ўрадам.

Як відаць, гэтыя задачы яшчэ ў невыстарчальнай меры ўсьвядомлены. Групай энэргетыкі, якая аьяўляецца адным з галоўнейшых нэрваў апарату ВСНГ.

Лепшым пацьвярджэньнем гэтага можа служыць той факт, што на сёнешні дзень у апараце гэтай групы накапілася значная частка праектаў, якія не разглядаюцца ўжо месяцамі. Гарады, фабрыкі і заводы чакаюць электрычнай энэргіі і сьвятла, якія закліканы карэнным чынам перабудаваць умовы работы і быту. Але апарат групы энэргетыкі не сьпяшаецца і працуе па-старому. З верасьня ляжаць праекты Магілеўскага скурзаводу, з лістапада—хладабойнага камбінату ў Воршы, заводу «Камінтэрн» у Віцебску, са студзеня месяца — фабрыкі штучнага валакна, шэйнай фабрыкі ў Віцебску і лютага месяца—фабрыкі «Дзьвіна», папяровай фабрыкі «Прафінтэрн», Барысаўскага камбінату «Камінтэрн».

Сакавік месяц яшчэ больш павялічвае гэтыя залежы. У чым справа? Чаму такія адносіны да такіх адказных задач? Няўжо-ж нельга было ў парадку сац. спаборніцтва і ўдарніцтва ліквідаваць гэтае ганебнае зьявішча. У групе энэргетыкі працуюць людзі з ненармаванай працай, якія павінны і скарыстоўваць вячэрні час, але гэтыя супрацоўнікі прытрымліваюцца вядомай прыказкі «цішэй едзеш, далей будзеш».

Фармалізм забівае жывы струмень у рабоце апарату. Вось ужо год, як цягнецца пытаньне з Бабруйскай электрастанцыяй. Перапіска разраслася да 10 аркушаў, а толку няма. Група прапануе, Бабруйск адказвае. Група зноў робіць заўвагі, а Бабруйск зноў адказвае. А ў выніку, як кажуць «воз і зараз там».

Вельмі слаба вядзецца работа па падрыхтоўцы спажыўцоў току Асінбуду. Няма рашучасьці і ў гэтым пытаньні. Работа абмяжоўваецца пакуль што адзнімі паперкамі. А трэба сказаць, што гэтае пытаньне зьяўляецца ўдарным вучасткам работы, бо ад току Асінбуду залежыць работа раду прадпрыемстваў.

Распрацоўваюцца анкеты, зьбіраюцца карткі, складаюцца пляны рацыяналізацыі, але няма ніякіх сыстэматычных матар'ялаў, якія-б характарызавалі становішча нашай парасілавай гаспадаркі. Пытаньне сабекошту і іншых важных момантаў зусім праходзіць міма групы.

Няма нарадку ў распрацоўцы пытаньняў аналу. Разьмеркаваньне аналу ідзе бяз сур'ёзнай падставы.

Асабліва цікавымі зьяўляюцца мэтады работы супрацоўнікаў гэтай групы. Што ні пытаньне, то камісія. Відавочна, супрацоўнікі групы энэргетыкі імкнуцца зьняць з сябе адказнасьць.

Вельмі цікавым узорам зьяўляецца той факт, што некаторыя супрацоўнікі ў групе пішуць адзін аднаму рэзалюцыі. «Азнаёмцеся з гэтым матар'ялам, а потым пагутарце са мной».

У заключэньне трэба яшчэ сказаць, што падпарадкаваньне ВСНГ прадпрыемствы і аб'яднаньні вельмі марудна адказваюць на тыя ці іншыя пытаньні, што яшчэ больш павялічвае бюракратычную перапіску.

Патрэбна карэннае лячэньне апарату. Такога становішча больш цярпець нельга. Чысткa апарату зьявіцца лепшым мэтадам паляпшэньня апарату ВСНГ і ўзмацненьня тэмпаў яго работы, якія ў сучасны момант так патрэбны для сацыялістычнага будаўніцтва.

БРЫГАДЗІР.

ЦІХАЯ СЯМЕЙКА ПАГОСКАГА

Спрытныя людзі, якія ўмеюць як належыць выкарыстоўваць сваё службовае становішча, часта на шкоду дзяржаве, яшчэ ня вывеліся ў нашых савецкіх установах.

Для прыкладу возьмем ВСНГ БССР, дзе працуе намесьнік начальніка плянава-тэхнічна-эканамічнага кіраўніцтва —**Пагоскі** і яго таварышы.

Улічваючы складанасьць «п'есы», якую яны разыгрываюць, кожны з іх меў асабістую невялічкую «ролю». Уся гэта кампанія, пад дырыжэрствам Пагоскага імкнулася ўнесьці антаганізм паміж інжынэрскай і бухгальтарскай часткай ВСНГ, габ самім можна было лавіць рыбу ў мутнай вадзе.

Правая рука Пагоскага—гэта **Дукар**, які скончыў савецкі ВУЗ, з тым, каб выкарыстоўваць свае веды для усялякіх інтрыг, каб хітра плесьці свае шкодныя планы і дагаджаць начальству.

Другі памочнік Пагоскага—гэта **Гольдбэрг**—«незамянімы, шчыра адданы працаўнік». За вельмі складаную працу ён атрымаў «падзяку» ад Менскага аддзяленьня Продасілкату.

Гольдберг зусім не падыходзіць да выконваньня даручанай яму справы. Але нічога, затое ён прыяцель Пагоскага.

Трэцім ідзе «тайны дарадца» Пагоскага—**Сальскі** — «непорочная дева», які нічога ня ведае. Пра шкодніцтва ў Папертрэсьце нават амаль і ня чуў, але затое добра чуе, калі пахне камандыроўкай.

Далей ідзе неадменны прыяцель і выканаўца ідэй Пагоскага — **Зэльдзін**, які парадзіўся з балянсам Лесбелу і мусіць памрэ на ім. Ён увесь час крычыць, што вельмі перагружаны і таму ніяк ня можа пераглядзець балянсу.

Нарэшце, **Казоўскі і Бравэрман**, якія выконваюць абавязкі адказных выканаўцаў па асабістых заданьнях.

Каб магчыма было праводзіць сваю палітыку ў трэстах, Пагоскі ўсюды імкнуўся насадзіць сваю радню. У радзе трэстаў галоўбухі зьяўляюцца сваякамі, і добрымі знаёмымі Пагоскага: у Белдзяржэлектрыце — Бэрковіч, у Хартрэсьце — Гольдбэрг, Гінзбург, Глікман і г.д. Знаёмыя Пагоскага ў сваю чаргу цягнулі сваіх знаёмых. У самім ВСНГ таксама нямала сваякоў Пагоскага — Казоўскі, Зэльдзін, Бэрковіч, Гольдбэрг, Брыль, Дукар, Біргер, і інш.

Усё гэта, зразумела, стварыла змову маўчаньня вакол ўсіх учынкаў Пагоскага. Усе непажаданыя гэтай кампаніяй выжываліся.

Нават прафэсыйная работа таксама была захоплена гэтай кампаніяй—Дукар —эканомкамісія, Гольдбэрг — мясцком, эканомкамісія, Пагоскі — эканомкамісія, Сальскі — мясцком, культкамісія, Казоўскі — эканомкамісія і г. д. Работа прафсаюзнай арганізацыі ў ВСНГ праходзіла бяз усякага ўдзелу мас.

Камісія па чыстцы павінна выцягнуць за «вушка дым на сонейка» усю гэту кампанію і аздаравіць затхлую атмасфэру ў ВСНГ.

БРЫГАДЗІР.

НАВЕДВАЛЬНІКАЎ ПРЫМАЮЦЬ У КАЛІДОРАХ

Шмат крычыць ВСНГ аб неабходнасьці ўзмацніць прадпысыпліну на вытворчасьці. Правільная арганізацыя працы зьяўляецца неабходнай умовай усялякай нармальнай работы.

Што-ж мы бачым у апараце ВСНГ? Кожны дзень значная частка супрацоўнікаў спазьняецца. Бяз усякай справы ходзяць па калідорах. Ёсьць выпадкі, калі некаторыя таварышы (у прыватнасьці, т. Паўловіч і інш.) прымаюць наведвальнікаў у калідоры на вокнах.

Такое становішча трэба лічыць недапушчальным. Штабу ВСНГ павінна быць вядома, што ў часе працы пакінуць свой варштат — недапушчальны факт. Гэта ў аднолькавай меры адносіцца і да работнікаў, якія працуюць у апараце. Рабочы дзень павінен быць максымальна ушчыльнены.

НАГЛЯДАЛЬНІК.

111.000 рублёў падаравалі прыватнікам

ХАРЧСМАКАВАЯ ГРУПА ВСНГБ І ХАРЧТРЭСТ ДАПАМАГАЛІ ПРЫВАТНІКУ

У часе абследваньня брыгадай харчсмакавай групы ВСНГБ высьветлілася абураючыя факты скрыўленьня клясавай лініі.

Харчтрэст значную частку прадукцыі харчсмакавай прамысловасьці рэалізаваў праз прыватны рынак. Работнікі групы тлумачаць гэта тым, што, моў, ня было рынку збыту для дрожджаў і піва. Часткова з гэтым можна і трэба было-б згадзіцца, каб толькі гэтым справа абмяжоўвалася. Але трэст ішоў далей. Рэалізаваўся праз прыватны рынак і востра дэфіцытны прадукт, як патака.

Прыватнік ухітраўся аб'ягорваць наш шаноўны трэст і харчсмакавую групу яшчэ і іншым шляхам — гэта дармова браць прадукцыю. Так, за 1927-28 г.з прыватнікаў сьпісана каля 80.000 руб., як сумнявальная запазычанасьць. Такім чынам, сьпісана за 1928-29 год 31.000 рублёў. Характэрна, што гэта рабілася ў 1929-30 годзе, калі партыя і рабочая кляса праводзілі найбольш рашучае наступленьне на капіталістычныя элементы.

На запытаньне брыгады работнік трэсту тав. Пузэўскі адказвае: «Чаго вы зьдзіўляецеся, я ўжо прызвычаіўся да гэтага».

Паводле Кляччіна выходзіць, што ўсё гэта нармальна, інакш ён і думаць ня можа, бо ня так даўно меў свой крухмальны завод.

Мы патрабуем прыцягненьня да судовай адказнасьці вінаватых у гэтым.

Д. СКАРАХОД,
рабочы «Чырвонай Зары» РУСІМСКІ.

Налёт на партфэлі

Налёт на партфэлі і сталы асобных працаўнікоў ВСНГ выявіў шмат матар'ялаў, якія сьведчаць аб значным бюракратызьме і цяганіне ў апараце ВСНГ. Бязумоўна, што больш паглыбленае вывучэньне працы асобных груп і працаўнікоў, да якога зараз ужо прыступілі рабочыя брыгады, пры дапамозе ўсёй рабочай грамадзкасьці, выявіць яшчэ больш прыкладаў бюракратызму і цяганіны, выявіць канкрэтных «посьбітаў зла», ілжа-спэцыялістых, чыноўнікаў, якія працавалі і працуюць толькі «пастолькі-наскольку».

З матар'ялаў палёту відаць, што бюракратызм ёсьць ня толькі ў рабоце апарату ВСНГ, але амаль усіх трэстаў, ціпер аб'яднаньняў.

Вось некалькі прыкладаў:

23-X 29 г. прапанавана было ўсім трэстам адначасова з гадавым прамфінпляном прадставіць паквадравыя пляны вырабу прадукцыі, зьніжэньня сабекошту, і капітальнага будаўніцтва.

Праз тры месяцы загадам за № 157 была пацьверджана неабходнасьць падачы паквадравых плянаў. Аднак, ня гледзячы на напамінаньні, 10 трэстаў не прадставілі паквадратнага пляну разгортваньня капітальных работ і 12 трэстаў паквартальнага пляну зьніжэньня сабекошту. Гэта не дае магчымасьці ні трэстам, ні ВСНГ сачыць за выкананьнем пляну. ВСНГ ня мае магчымасьці, згодна прапановы СНК, прадставіць квадравых плянаў у Дзяржплян.

Да гэтага часу многія трэсты не падалі ўсіх справаздачных матар'ялаў выкананьня пляну капітальных работ за 28-29 г. Праз 7 месяцаў пасьля сканчэньня гаспадарчага году няма справаздачы, як выкананы плян капітальнага будаўніцтва за 28-29 г.

Прамфінплян **Лесбелу** на 29-30 г. прыйшоў умоўна і прапанавана было яму склясьці канчаткова ўдасканалены плян. Ня гледзячы на рад напамінаньняў, гэта ня зроблена і дагэтуль. Такім чынам лесбел на працягу 7 месяцаў па сутнасьці працуе бяз усякага пляну.

8-VIII 29 г. **Белмэталятрэсту** прапанавана прыслаць матар'ялы аб эканоміі ў мэталях. Пасьля раду напамінаньняў трэст 7-IX 29 г. піша це аб тым, што ім канкрэтна зроблена, а аб тым, што ён мяркуе зрабіць і на наўторнае запытаньне, што канкрэтна зроблена, няма адказу і дагэтуль.

10-X 29 г. Белшапертрэсту было прапанавана прадставіць на бліжэйшае пасяджэньне прэзыдыуму ВСНГ даклад аб забесьпячэньні фабрык трэсту сырцом і поўфабрыкатамі. Заданьне прэзыдыуму ВСНГ БССР Папертрэстам яшчэ выконваецца (7-мы месяц).

Гадавыя справаздачы трэстаў за 28-29 год ВСНГ даўно атрыманы (студзень месяц), але дрэнная якасьць матар'ялаў не дае магчымасьці належна іх скарыстаць і гадавое справаздачы аб дзейнасьці прамысловасьці за 28-29 г. па сёнешні дзень мы ня маем.

Можна было-б пералічваць гэтыя факты і яшчэ. Але, нам здаецца, і гэтых досыць, каб зрабіць вывад, што апараты трэстаў сур'ёзна хворыя і што іх трэба ня толькі «лячыць», але і добра чысьціць.

Зусім зразумела, што ні гэткай працы ні апарат ВСНГ, ні трэсты не змаглі дапамагчы прадпрыемствам у справе выкананьня прамфінпляну.

А.

ЗГУБЛЕНАЯ ФАБРЫКА

Кастрычніцкая рэвалюцыя зьнішчыла прыватную ўласнасьць на фабрыкі і заводы і перадала іх сапраўднаму і непасрэднаму гаспадару—рабочай клясе.

Здаецца, што працаўніком нашага дзяржаўнага апарату гэта павінна быць добра вядома, аднак некаторыя забылі пра гэту ісьціну.

Аб гэтым красамоўна гаворыць факт, па які натыкнулася рабочая брыгада пры праверцы групы мясцовай прамысловасьці ВСНГБ. Зусім выпадкова высьветлена, што ў Віцебску існуе і бязьдзейнічае шпалерная фабрыка, якая да гэтага часу зусім ня ведае, што гэта фабрыка наогул існуе, для яе гэта зьявілася «открытием Америки».

Зараз выяўляецца, што ў свой час, некалькі год таму назад, гэтае абсталяваньне знаходзілася ў памяшканьні фабрыкі і яго можна было скарыстаць. Але паводле загаду мясцовых органаў абсталяваньне разабралі і перанесьлі ў склеп, дзе яно да гэтага часу і валяецца. Ёсьць чуткі ,што адна добрая машына ўжо перадана былому ўласьніку.

Бясспрэчна, што мы маем тут факт галавацяпства з боку некаторых работнікаў мясцовай прамысловасьці, якія дзейнічалі ў разрэз з клясавай палітыкай савецкай улады.

Адпаведным органам трэба зацікавіцца гэтай справай, выявіць і прыцягнуць да адказнасьці тых асоб, якія вінаваты ў такой абураючай безгаспадарчасьці.

БРЫГАДЗІР.

РВАЧ

Інжынэр **Іваноў**, які працуе ў ВСНГБ, атрымлівае пэнсію большую ад усіх іншых спэцыялістых — 550 рублёў па месяц (жыць можна), ды рублёў 150 на месяц у сярэднім камандзіровачных. Але-ж гэта мала, дык ён яшчэ выкладае ў БДУ і там атрымлівае рублёў 200-250, а разам да 950 рублёў.

У сувязі з рэарганізацыяй апарату і недахопам спэцыялістых **Іваноў** пасылаецца ВСНГБ у Тэкстыльаб'яднаньне ў Віцебск, або на фабрыку—але-ж ён ад гэтага адмаўляецца, баючыся страціць... 200-250 рублёў.

Ад 3-га да 10-га красавіка ён вядзе перамовы з рознымі арганізацыямі і быццам здае справы... Адначасова ён падае заяву, што ня можа кідаць лекцый ва ўнівэрсытэце і просіць вымяніць пастанову аб перамяшчэньні, ён просіць паслаць яго на галянтарэйную фабрыку. Фабрыка рада—яна будзе мець інжынэра.

Але-ж дармо радавалася фабрыка 11 красавіка зьявіўся Іваноў і запатрабаваў каб яго звольнілі.

Падаў маленькі рахуначак... Пры гэтым Іваноў за водпуск лічыць—550 р., 2-хтыднёвая выхаднае дапамога — 275 рублёў... ды... і яшчэ за 5 дзён быццам за нескарыстаныя выхадныя дні—яшчэ 90 рублёй—усяго да 900 рублёў.

І вось ужо 18-га красавіка, а Іваноў (усё без выхаднае дапамогі, бо яго не звальняюць)—нічога ня робіць, а сядзіць цэлымі днямі ад 9 гадзін да 4-х і ўсё дамагаецца свайго.

Чым можна тлумачыць такі ўчынак з боку спэцыяліста ў нэрвыд такой напружанай работы. Рвацтвам, шкурніцтвам, клопатамі толькі ад сябе. Будуйце сабе на здароўе, а мне давайце грошы...

Трэба спадзявацца, што камісія па чыстцы зацікавіцца тварам **Іванова** і тымі камандзіравачнымі выдаткамі, якія ён рабіў.

Трэба спадзявацца, што аб інжынэры, які ня хоча ісьці на прадпрыемства, скажа сваё слова МБІТ і грамадзкасьць ВСНГ БССР.

Я. ІЗАКАЎ.

Парушылі мірны пакой бюракратаў

Недае высока... на вышы ў ВСНГ, знаходзіцца пажарная інспэкцыя. Аб ёй амаль што нічога не вядома.

Мірнае жыцьцё гэтай інспэкцыі нядаўна парушыла ўдарная брыгада ўсебеларускіх пажарных курсаў, якая абсьледвала работу групы.

Што-ж выявілася? За ўвесь час існаваньня пажарна - страхавое групы справаздачнасьць яе на прэзыдыуме не заслухоўвалася. Плянавасьць у рабоце адсутнічала. Сувязь з масамі нікуды ня вартая. На працягу 2-х галоў была праведзена толькі адна канфэрэнцыя добравольных пажарных дружын. Вучоту работы і працінжэнрных мерапрыемстваў на прадпрыемствах амаль што не вядзецца. Перапіска залежваецца да 2 і больш месяцаў.

Кепска стаіць справа і з рэгаваньнем на газэтныя допісы.

У неадвальнючым выглядзе знаходзіцца ўсе справаздачы.

Нядбала адносіцца пажарна - страхавая група і да пажарных курсаў. Дастаткова сказаць, што 27-га красавіка канчаюцца заняткі, а курсанты да гэтага часу ня ведаюць куды яны пойдуць і якія яны будуць выконваць абавязкі. А трэба адзначыць, што на курсы былі выдаткаваны вялікія сродкі.

Вельмі цікавымі зьяўляюцца адносіны Розэнталя, адказнага супрацоўніка групы, да курсаў. У адным з гутарак з курсантам тав. Розэнталь заявіў: «напрасна вы прыехалі на курсы, яны вам нічога не дадуць».

Вядома, калі да курсаў будуць такія няўважлівыя адносіны, дык яны, нічога не дадуць.

Такія адносіны да справы пажарнай аховы нашых прадпрыемстваў трэба лічыць недапушчальнымі і злачынымі. Камісія па чыстцы павінна рашуча ўзяцца за гэту справу і выкарчаваць з групы тых хто зрывае работу на аздараўленьні гаспадаркі нашай прамысловасьці.

ВСНГБ павінен зацікавіцца

Пры ВСНГБ у гэтым годзе адкрылася **горна - керамічныя курсы**, разьлічаныя на два гады. Нармальны тэрмін навучаньня (4 гады) такім чынам скарочаны ў два разы. Здавалася-б, што кіраўнікі курсаў прымуць усе захады да таго, каб, ня зьніжаючы якасьці падрыхтоўкі курсантаў, забясьпечыць поўнае выкананьне навучальных плянаў. Атрымалася-ж зусім ня так. Навучальны плян фактычна сарваны. За 82 дні работы курсаў, пачынаючы з 1-га лютага, замест 600 навучальных гадзін прапрацавана толькі 365 гадзін. Такім чынам, на іншыя 40 дзён прыпадае амаль палова навучальнага пляну — 295 гадзін. Па такой важнейшай для курсаў дысцыпліне, як горная справа, навучальны плян выканан толькі на 1/3 частку. Па другіх дысцыплінах справа яшчэ горшая.

Якія-ж захады да паляпшэньня становішча прымае кіраўніцтва курсамі ў асобе загадчыка т. Кляцько і яго памочніка па навучальнай частцы т. Сінякова? Аб гэтым нічога сказаць нельга, апрача таго, што вось ужо на працягу некалькіх месяцаў вядуцца гутаркі аб адзіным мэтадзе выкладаньня і мэтадах праверкі ведаў. Гэтыя гутаркі не перашкаджаюць таму, што выкладаньне і праверка ведаў вядзецца паводле прыслоўя: «кожны малайзец на свой абразец». Наколькі сур'ёзны ня былі гэтыя гутаркі, паказвае тое, што за ўвесь час па гэтым пытаньні ня было ні аднэй педагагічнай нарады.

Да гэтага нярадаснага малюнку трэба дадаць, што і прэзыдыум ВСНГБ, стварыўшы курсы, не пацікавіўся, аднак, наколькі мэтазгодна затрачваюцца на іх сродкі і як пастаўлена там падрыхтоўка чырвоных гарнізкоў.

КУРСАНТЫ.

Рабочыя вынаходзтвы, якія ня ўбачылі сьвету

Вынаходніцтва і рацыяналізацыя ў заняпадзе

ВЫНАХОДНІЦТВА І БЮРАКРАТЫЗМ... Якія, здае крайнасьці. На жаль, трэба адзначыць, што ў нас гэтыя дзьве крайнасьці часта ўжываюцца. У той час, калі за мяжой спэцыяльныя агенты разьвядваюць і шукаюць вынаходцаў, у нас вынаходца часта сустракаецца з бюракратычнымі, бесстароннімі адносінамі, мыкаецца бясконца з рэзалюцыямі «лічыць мэтазгодным правесьці ў жыцьцё вынаходніцтва, якое, бязумоўна, дае эканамічны эфэкт». Вандруючы па розных габінэтах, вынаходца, нарэшце, выбіваецца з сіл, і зусім закідвае сваё вынаходніцтва.

Усё гэта вельмі выразна выявілася на нарадзе вынаходцаў пры ВСНГБ, якая ўпярыню была склікана паводле патрабаваньня камісіі па чыстцы апарату. Вынаходцы — рабочы, служачыя, якія выступалі на гэтай нарадзе, выявілі, як група рацыяналізацыі і вынаходзтва на справе дапамагала рабочаму вынаходніцтву.

Дагэтуль некаторыя з працаўнікоў ВСНГ яшчэ ня могуць расстацца з тэй думкай, што вынаходцай можа быць толькі інжынэр, толькі яго вынаходзтва аўтарытэтна. Прыкладам гэтаму можа служыць наступны факт: рабочы запалкавай фабрыкі ўжо даўно ўнёс прапанову, каб запалкі пакавалі не пасяткамі, а проста ў скрыні. Зразумела, гэта значна скарачае працэс работы і дае эканомію. Але чамусьці гэту прапанову адхілілі. Калі-ж гэту самую прапанову ўнёс інжынэр Савіцкі, то адразу зацьвердзілі і выдалі яму прэмію ў 500 рублёў.

У нас любяць вынаходзтвы, якія адразу-ж даюць эфэкт без затраты ўсялякіх сродкаў. Калі-ж вынаходзтва патрабуе пабудовы якой-небудзь машыны або апарату, вам зайдуць адказваюць: «прычыны адсутнасьці рабсілы, у нас выраблена быць на мяжа», або «матар'ял для вырабу машыны дэфіцытны» і г. д.

Рабочыя з прадпрыемстваў, якія выступалі на нарадзе, шмат сьпяталіся на бюракратызме і бюро вынаходзтваў, якое ня толькі не дапамагае вынаходцам, але нават перашкаджае ім.

Рабочы шпалерна фабрыкі Штэрман расказаў аб тым, як бюро вынаходзтва пахавала ў сваіх нетрах праект машыны для скарыстаньня адкідаў.

Рабочы фабрыкі «Кастрычнік» т. Левін падкрэсьліў, што дапамога вынаходзтву на прадпрыемствах паставлена вельмі дрэнна: ні гуртковоў, ні тэхнічнай дапамогі вынаходцам.

Ня лепшая справа і з рацыяналізацыяй. Фактычна адсутнічае аб рацыяналізацыі на шмат прамысловасьці і выканана. Плян рацыяналізацыі да гэтага часу няма. На прадпрыемствах ячэйкі рацыяналізацыі ня створаны. Для арганізацыі курсаў рацыяналізатараў падышлі габінэтным парадкам. Склад настаўнікаў нездавальняючы. Для заняткаў ня створана належных умоў.

Усё гэта гаворыць аб тым, што група вынаходзтва і рацыяналізацыі не стварыла патрэбных умоў для разьвіцьця рабочага вынаходніцтва. Гад каштоўных рабочых прапаноў не ажыцьцёўлен. Нічога ня зроблена для стымуляваньня вынаходзтва. Недапушчальнымі зьяўляюцца адносіны ВСНГ да справы рацыяналізацыі. Усё гэта сьведчыць аб значных прарывах у работе ВСНГ на адным з важнейшых вучасткаў прамысловасьці.

В.

* * *

Больш двух год таму назад рабочы Магілеўскага працэктыву рымарны Арунін вынайшоў рымарны рышавальны варштат для скручэньня рамянёў. Гэты варштат дае шмат эканамічных выгад. Работа аднаго чалавека з гэтым варштатам замяняе ручную работу амаль 12 чал. Акрамя таго варштат палепшае і якасьць прадукцыі.

Усё гэта прыслала і бюро дапамогі рабочаму вынаходзтву пры ВСНГБ у сваім пасяджэньні 21-га лютага 1928 г. Бюро вынаходніцтва даручыла аддзелу мясцовай прамысловасьці ВСНГ дагаварыцца з Магілеўскім аддзелам комунальнай гаспадаркі аб тэхнічнай дапамозе Аруніну ў сэнсе падрыхтоўкі чарцяжоў і праекту машыны для апраўкі ўсіх матар'ялаў па вынаходзтву галоўны камітэт у Ленінград.

Аддзел мясцовай прамысловасьці і кіраваў пастанову бюро вынаходніцтва 16-га сакавіка 1928 году інспэкцыі мясцовай прамысловасьці ў Магілеве і гэтым супрацоўніцтвам.

З таго часу прайшло ўжо больш два гады, а справа гэта ня зрушылася з месца. Усе праекты рабочага Аруніна ўвесь гэты час спакойна праляжалі шафе ў Магілеўскай інспэкцыі мясцовай прамысловасьці і пакрыліся тоўстым пластом пылу. Сам вынаходца, які ўвесь гэты час знаходзіўся ў радах Чырвонай арміі, не адзін раз пісаў як у Менск так і Магілеў, але дарэмна. Толькі ўжо пасьля вынаходца зноў зьвярнуўся ў бюро дапамогі вынаходзтву пры ВСНГБ, і зараз, у сувязі з чысткай апарату, спамянуліся і абапалі зрушыць гэту справу. Пабачым, хто варты гэтыя аддзяньні

К.

ШТАБ ПАД АБСТРЭЛАМ

Сустрэча „камунаразуцаў" з работнікамі ВСНГБ

Нядаўна адбылася сустрэча рабочых камунаразуцаў з падпэфнымі ім работнікамі апарату ВСНГ. 200 чал. рабочых прышлі паслухаць даклад аб тым, як кіраваў ВСНГ найбольш адказнай галіной народнай гаспадаркі.

Шмат карыснага дала гэта сустрэча. **Аб чым дакладваў ВСНГ?** Ці правільная была яго работа па ажыцьцяўленьні лініі партыі і ўрадовых дырэктыў, ці ішоў ВСНГ у нагу з ростам энтузіязму рабочае клясы?

Член прэзыдыуму ВСНГБ тав. **Страноўскі** ў адказ на гэтыя пытаньні дае кароткую ацэнку разьвіцьця прамысловасьці, якая на працягу 1926-27 — 1930-31 гадоў паказвае ўзрост прадукцыі па цэнах 1926-27 г. з 86 млн. руб. да 643 млн. руб., **г. зн. прамысловасьць вырастае прыкладна ў 8 раз.**

Капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьці ўзрасьлі з 5 млн. руб. у 1926-27 г. да 50 млн. руб. у 1929-30 г.

У параўнаньні з іншымі рэспубліканскімі БССР дае найбольш шпаркі тэмп індустрыялізацыі. Найбольшыя ўкладаньні ідуць па лініі дрэваапрацоўчай, запалкавай і харчовай прамысловасьці.

Аднак, цэлы рад дырэктыў выкананы. Заданьне аб зьніжэньні сабекошту замест 11 проц. выканана за першае паўгодзьдзе прыкладна на 7 проц. Кепская справа і з якасьцю прадукцыі. Слаба была прыцягнута рабочая грамадзкасьць да ўдзелу ў рэарганізацыі сыстэмы кіраўніцтва прамысловасьцю.

ВСНГ павінен узяць на сябе віну за рад дапушчаных ім памылак. Нельга сказаць, што ВСНГ ня быў вінаваты ў тых скрыўленьнях, якія мелі месца ў рабоце Белсамтрамсаюзу.

ВСНГ невыстарчальна ўважліва падыходзіў і да пытаньняў увязкі прамысловасьці з патрэбамі сельскае гаспадаркі.

Зусім слабая ўвага была зьвернута на пытаньні арабочаньня апарату.

Недапушчальным зьяўляецца і той факт, што ў самым апараце ня былі выкрыты выпадкі шкодніцтва, якія мелі месца ў прамысловасьці.

На тэзіс крытыка і самакрытыка тав. Страноўскага і скончылася. Трэба адзначыць, што даклад тав. Страноўскага ў большай частцы быў утрунтаваны на агульных недахопах. У меншай меры чамусьці тав. Страноўскі сьпыняўся на канкрэтных недахопах і фактах цяганіны і бюракратызму, якія маюць месца ў апараце ВСНГ.

Аб гэтым гаварыў у сваім судакладзе тав. Левін — старшыня камісіі па чыстцы ВСНГ.

Апарат ВСНГ яшчэ не перабудаваў мэтадаў сваёй работы ў адпаведнасьці з рэканструкцыйным пэрыядам.

Цяганіна, бюракратызм, безадказнасьць і самастрахоўка — зьвілі сабе моцнае гнязда ў апараце ВСНГ.

**Апарат ВСНГ працуе без усялякага пляну. Ужо прайшло 6 месяцаў новага году, а плян работы яшчэ не расп

МАЛОЧНЫЯ ФЭРМЫ БЕЗ КАРОЎ

Хто адказа за дзейнасьць Шапетаўскай экспэдыцыі?

У беларускіх прыгарадных малочных фэрмах павінна было быць пастаўлена 10.000 штук малочнай жывёлы. На сёньняшні дзень ёсьць толькі каля 5.000. Такое фактычнае становішча ў 12 калгасах, якія адведзены пад прыгарадныя малочныя фэрмы.

Адзін з асноўных прычын неўкамплектаванасьці малочных фэрм жывёлай вынікаецца правал загатоўкі малочных коўраў на Украіне. Ня гледзячы на высокія цэны і трудасьці куплі жывёлы на Украіне, некаторыя жывёлагадоўчыя саюзы Беларусі ўсё-ж накіравалі туды свае погляды ў надзеі атрымаць добрых удойных коўраў. Гомельскі аграмалажэйскі наваг камандыраваў спэцыяльную экспэдыцыю ў Шапетаўскую акругу. Хутка паступіла першая партыя скаціны: 200 штук для Гомелю і 100 штук для Менску. Апошнімі была ўкамплектавана малочная фэрма імя тав. Фрунзэ пад Менскам. Экспэдыцыя меркавала разгарнуць загатоўкі ў Шапетаўскай акрузе і ўзмацніць адгрузку. Але тут выявіліся вельмі незадавальняючыя рэзультаты першай куплі. Абсьледаваньнем спэцыяльнай камісіяй, прысланай на фэрму імя т. Фрунзэ, 190 коўраў, было устаноўлена, што 5,9 проц. з іх наўдойныя і для малочнай фэрмы ня годны. Астатні-ж 50 проц. ня толькі ня лепшыя за беларускія каровы сярэдняй якасьці, але навет горшыя.

Наогул за украінскія каровы было заплачана ў тры разы даражэй, чым тая партыя каштавала-б на беларускім рынку. Страты перавысілі 12.000 рублёў.

Пасьля гэтага беларуская малочна-жывёлагадоўчая каапэрацыя ўсьвядоміла ўсю навыгоднасьць куплі малочнай скаціны на Украіне і пераносіла зьвярнуць сваю ўвагу на беларускі рынак. Але тут яна спаткалася з непераможнымі перашкодамі. Наркамгандлем і Наркамзэмам было цьвёрда заяўлена, што ў межах Беларусі малочная жывёла можа загатоўлівацца па цэнах ня вышэй мясазагатоўчых. Гэта значыць, што за прадукцыйную карову, якая цэніцца на рынку ў 150-200 руб., малочна-жывёлагадоўчыя саюзы могуць плаціць прыблізна каля 50 руб. Зусім зразумела, што пры такіх умовах малочная жывёла, якая выкідваецца на рынак, у рукі каапэрацыі траціць ня можа. Трэба таксама ўлічыць, што за апошні час узмацніўся попыт на прадукцыйную жывёлу і з боку індывідуальніка. Цікава, што беларускія рэгулюючыя органы не супярэчылі супроць загатоўкі скаціны на Украіне па яшчэ больш высокіх цэнах, чым у Беларусі.

Гісторыя з мясазагатоўчымі цэнамі на малочную скаціну характэрызуе неаваротлівасьць беларускіх рэгулюючых органаў і іх нявуменьне хутка рэагаваць на абстаноўку, якая стваралася. Па сьлядох Наркамгандлю Беларусі ідуць і некаторыя адказныя работнікі Наркамзему.

У пачатку бягучага году, між іншым, Наркамгандлем і Наркамзэмам БССР, у самы разгар разбазарваньня жывёлы, былі раптам устаноўлены вельмі высокія цэны на прадукцыйную жывёлу, што яшчэ больш стымулявала разбазараваньне жывёлы. Пасьля ўмяшаньня «Зьвязды» гэта было скасавана і выдана пастанова, якая забараніла плаціць за малочную скаціну вышэй, чым за мясную. Гэты парадак існуе да гэтага часу, ня гледзячы на тое, што прычыны, якія яго выклікалі, ужо няма, што пастанова аб ураўнілаўцы цэн на малочную і мясную скаціну зараз яўна б'е па калгасах і проста страціла ўсякі сэнс.

Двухмесячныя просьбы малочна-жывёлагадоўчай каапэрацыі ні да чога не прывялі. Наркамгандаль і Наркамзем усё яшчэ стаяць на сваім. У выніку—беларуская прадукцыйная жывёла, якая ёсьць на рынках, ня можа быць закуплена малочнымі фэрмамі.

Л. Н.

Агляд яшчэ не стварыў пералому

у справе грамадзкага харчаваньня у БССР

Абсталяваньне для сталовак павінна вырабляцца

Пастанова ЦВК БССР

На апошнім пасяджэньні прэзыдыум ЦВК БССР абгаварыў даклад Цэнтральнай агляднай камісіі пры рэдакцыі «Зьвязды» і даклад Белкаапсаюзу аб ходзе агляду грамадзкага харчаваньня ў Беларусі.

З дакладу вынікаецца, што ход грамадзкага харчаваньня зацягваецца і пазваляецца дасягненьнямі нельга. З боку некаторых каапэратараў і прафэсіянальных арганізацый назіраецца недазнаўка гэтай кампаніі. Такія выпадкі мелі месца ў Магілеўскай, Аршанскай, Віцебскай, Гомельскай і Бабруйскай акругах. Становішча грамадзкага харчаваньня ў паказаных акругах вельмі дрэннае, сетка зусім малая, яна ахапляе вызначную частку рабочых спажыўцоў. Разам з гэтым у Менску грамадзкім харчаваньнем ахоплена працоўная насельніцтва ня больш, як 10%, а ў іншых акругах процант ахопу хісткаецца [illegible] і [illegible]ей.

Існуючыя сталоўкі перагружаны: за[illegible] адпускаюць 2-3 тыс[illegible] абедаў, адбіваецца на [illegible] якасьць ніякая, а цэны [illegible]окія. Разам з гэтым [illegible] норма мяса і інш[illegible]. [illegible]х ужо даўно зьні[illegible], а каапэрацыя [illegible] усё яшчэ зьбіра[illegible] зьніжць цэны. Такім чынам выходзіць, што якасьць грамадзкага харчаваньня пагоршылася, а цэны стабільныя.

У сувязі з аглядам грамадзкага харчаваньня ўзьнікае пытаньне аб набудове новых сталовак. Гэта будаўніцтва ў Беларусі разгарнулася вельмі шырока: так, напр., менскі ЦРК мяркуе адчыніць 30 новых сталовак з павялічэньнем колькасьці рабочых спажыўцоў на 17.000 чалавек. Гэ[illegible] 40 новых сталовак разам з фабрычай-кухняй. Такі самы малюнак мы маем у Магілеўшчыне і Віцебшчыне. Але... выйдзе так, што будаўніцтва скончыцца, будуць стаяць вельмі прыгожыя будынкі, а адпо[illegible] сталовак будзе нельга за адсутнасьцю патрэбнага абсталяваньня. ВСНГ зусім не адпускаўся на агляд грамадзкага харчаваньня і нічога ня робіць для выпрацоўкі абсталяваньня для сталовак.

Прадстаўнік Белкаапсаюзу і член цэнтральнай аглядавай камісіі сьцьвердзілі ў Маскву, каб дабіцца дазволу абсталяваньня для сталовых, ў выніку прыезьдзі толькі дзьве бульбачысткі. Ад пачатку агляду прайшло паўтара месяцы, а дагэтуль яшчэ нічога ня робіцца, каб як-небудзь змясьці з такога становішча. Менскі ЦРК заказаў зрабіць на Ізорным тэрмасе Барысаўскай самаходнай арцелі. Тэрмас выйшаў ня горш чым заменны. Такім чынам выходзіць, што самаходныя арцелі могуць выпускаць абсталяваньне, дык чаму-ж наша прамысловасьць ня можа разгарнуць гэту вытворчасьць.

З наближэньнем восеньняй пасоўнай кампаніі было пастаўлена пытаньне аб арганізацыі грамадзкага харчаваньня у калгасах. Паводле плану Белкаапсаюзу ў калгасах 200 стацыянарных сталовак і 400 перасовачных кухань-ачагоў. Не зважаючы на ўсе сыгналы друку, справа арганізацыі грамадзкага харчаваньня ў калгасах сарвана. Сяўба ідзе, перасовачных кухань няма, а Белкалгасцэнтр і Белкаапсаюз больш двух месяцаў вядуць «прынцыповыя спрэчкі», хто павінен кіраваць справай грамадзкага харчаваньня ў калгасах.

Яго лепш стаіць справа з дзіцячым харчаваньнем. Да гэтага часу нельга знайсьці кіраўніка, які заняўся-б гэтай справай. Наркамасьветы адмаўляецца, Наркамаховы Здароўя адмаўляецца, а Белкаапсаюз кажа, што з яго досыць таго, што ён забясьпечвае прадуктамі.

Дрэнна стаіць справа з падрыхтоўкай кадраў для грамадзкага харчаваньня. Каапэрацыя займаецца саматужніцтвам, рыхтуючы ў паасобных гарадох на 5-10 чалавек кухароў, а прафсаюзы не прасачылі за тым, каб выканаць план ФЗВ па грамадзкім харчаваньні. Прадстаўнік Белкаапсаюзу заявіў, што кухароў зусім няма і яны ня могуць адкрыць ніводнай сталоўкі.

У часе агляду грамадзкага харчаваньня мелі месца некаторыя дэфэкты. Брыгады праводзілі агляд «падпольна», ня ўцягваючы ў гэту справу рабочай грамадзкасьці свайго прадпрыемства. Прафсаюзныя арганізацыі і гаспадарнікі стаяць у баку ад гэтай вельмі важнай кампаніі. Мелі месца і такія выпадкі, калі паасобныя гаспадарнікі прасілі, каб на прадпрыемствах закрылі сталоўкі, а ў гэтых памяшканьнях пашырылі... канцылярыю. Справа з грамадзкім харчаваньнем знаходзіцца не на вышыні. Некаторыя пэрабкоўцы, замест паляпшэньня грамадзкага харчаваньня, клапоцяцца аб атрыманьні большага прыбытку ад гэтай справы. Напрыклад, Полацкі ЦРК «умудрыўся» атрымаць ад установы грамадзкага харчаваньня прыбытку 37.000 руб., Бабруйскі—каля гэтай сумы, Магілеўскі — 26.000 руб. Паводле слоў прадстаўніка ВСНГБ на будаўніцтва ў гэтым годзе адпушчана звыш 987.000 рублёў, але ніводная новая сталоўка, якая будуецца, не забясьпечана абсталяваньнем. Толькі з наступнага году ВСНГ мяркуе разгарнуць выпрацоўку абсталяваньня для буйных сталовак і фабрык-кухань.

***

Заслухаўшы даклад Цэнтральнай аглядавай камісіі пры газэце «Зьвязда» і суладклад Белкаапсаюзу аб ходзе агляду грамадзкага харчаваньня ў БССР, прэзыдыум ЦВК БССР **адзначае:**

а) агляд грамадзкага харчаваньня пачаўся і праводзіцца пры недастаткова актыўным удзеле савецкіх і грамадзкіх арганізацый і друку;

б) ня гледзячы на ўзрост сеткі сталовак і колькасьці абедаў, ён адпушчаюцца, становішча грамадзкага харчаваньня ўсё яшчэ зьяўляецца зусім незадавальняючым, як у сэнсе кольвасьнага ахопу запатрабаваньняў рабочых мас, так і на якасьці работы, пры гэтым ва ўсёй сыстэме спажывецкай каапэрацыі да апошняга часу назіраецца недастаткова ўвага да задач грамадзкага харчаваньня.

Прэзыдыум ЦВК лічыць, што першапачатковымі практычнымі задачамі ў галіне грамадзкага харчаваньня павінны быць: пашырэньне сеткі сталовак, патаньненьне кошту абеду ў рабочых фабрычна-заводзкіх сталоўках, палепшаньне якасьці абедаў ва ўсіх сталоўках і большы ахоп грамадзкім харчаваньнем рабочых і іх сем'яў.

Выходзячы з гэтага і ў мэтах пашырэньня і палепшаньня работы па агляду і забясьпячэньні канкрэтных выпікаў агляду, прэзыдыум ЦВК **пастанаўляе:**

1. Абавязаць усе АВК і гарсаветы заслухаць на бліжэйшых сваіх пасяджэньнях (прэзыдыумаў АВК і пленумаў гарсаветаў) даклады аб ходзе агляду і становішчы грамадзкага харчаваньня, вызначыць рад практычных мерапрыемстваў і аказаць канкрэтную дапамогу ў пашырэньні работы па агляду і палепшаньні справы грамадзкага харчаваньня.

2. З прычыны вялікага недахопу інвэнтару, што стварае пагрозу арыву далейшага пашырэньня сеткі грамадзкага харчаваньня, даручыць:

а) СНК БССР вырашыць пытаньне аб плянавым завозе абсталяваньня, а таксама распрацаваць пытаньне аб магчымасьці выпрацоўкі гэтага абсталяваньня на месцы ў БССР;

б) Белкаапсаюзу ужываць мэтад згодна вопыту, які ў яго маецца, заказаў абсталяваньня у мясцовых саматужных арцелях.

3. Прапанаваць СНК у бліжэйшы час разглядзець пытаньне аб падрыхтоўцы кадраў для патрэб грамадзкага харчаваньня праз тэхнікумы і вышэйшыя навучальныя ўстановы.

4. Абавязаць Народны Камісарыят Аховы Здароўя ўзмацніць санітарны нагляд за работай сталовак, адначасова узмацніўшы работу ўсіх інстытутаў у галіне навуковага дасьледваньня грамадзкага харчаваньня.

5. Абавязаць Белкаапсаюз, НК Аховы Здароўя і НК Працы прыняць рашучыя меры да пашырэньня арганізацыі дыэтахарчаваньня, а таксама і яго патаненьня.

6. Прапанаваць Наркамгандлю і Белкаапсаюзу пры складаньні пляну разьмеркаваньня прадуктаў улічваць неабходнасьць правільнага і свалгасовага забесьпячэньня спажывецкай каапэрацыі прадуктамі для патрэб грамадзкага харчаваньня.

7. Абавязаць Белкаапсаюз разам з Калгаспэнтрам і Белсельтрэстам прыняць адначасныя меры да поўнага выкананьня усіх існуючых дырэктыў па пытаньні арганізацыі грамадзкага харчаваньня у саўгасах, камунах, агракамбінатах і калгасах.

8. Заслухаць пасьля сканчэньня агляду грамадзкага харчаваньня даклады Цэнтральнай аглядавай камісіі і Белкаапсаюзу аб выніках агляду і прынятых мерах да пашырэньня і палепшаньня грамадзкага харчаваньня, а таксама і аб арганізацыі грамадзкага кантролю над гэтай работай.

МЕНСК

ПЕРАВЫБАРЫ ПРАФОРГАНАЎ У БССР

Згодна пастановы прэзыдыуму ЦПСПБ перавыбары фабрычна-заводзкіх камітэтаў будуць адбывацца з 1-га мая па 1-га жніўня. Перавыбары па саюзе працасьветы і мастацтва будуць праводзіцца ў жніўні і верасьні месяцы, а па саюзе чыгуначнікаў—перад пачаткам веснавых перавозак. Рэспубліканскія зьезды прафсаюзаў адбудуцца па сканчэньні перавыбараў ФЗМК з такім разьлікам, каб верасьня зьезды былі скончаны да 15-га верасьня. Усебеларускі зьезд прафсаюзаў мае адбыцца у другой палове верасьня.

ПАБУДОВА ДРУГОЙ РАЁННАЙ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ

Гэтымі днямі ў Гомель выязджае з Менску спэцыяльная камісія з прадстаўнікоў ВСНГ, Дзяржпляну, Ленінградзкага Энэргабуду і НКШЗ для канчатковага выбару месца пад пабудову другой дзяржаўнай раённай электрастанцыі ў Гомелі. Наркамфін ужо адпусьціў 50.000 руб. на падрыхтоўчыя работы да будаўніцтва. Праектыроўка станцыі і тарфяной гаспадаркі павінна быць скончана да 15-га жніўня.

ПАСТАНОЎКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ВАНДРОЎНЫХ ТЭАТРАЎ

Беларускі вандроўны тэатр у канцы красавіка выехаў на Магілеўшчыну, дзе даў цэлы рад пастановак. Ім ужо абсьледаваны Крычаўскі раён, цяпер тэатр пераязджае ў Клімаўшчыну. Яўрэйскі вандроўны тэатр наведаў Барысаў, Койданава, а зараз працуе ў м. Вузда. У бліжэйшы час у Сьмілавіцкі раён выязджае польскі вандроўны тэатр.

Беларускі рабочы вандроўны тэатр рыхтуе першую пастаноўку «Стрэл»—**Безыменскага.** Работа вядзецца пад кіраўніцтвам маскоўскага балетмэйстра г. Вульфа.

ЗА ДЗЕНЬ

— **Новы старшыня галоўмастацтва.** У сувязі з пераходам т. Некрашэвіча на работу ў Белдзяржвыдавецтва старшынёй Галоўмастацтва БССР назначаны т. Гурскі І.

— **Антырэлігійныя курсы.** Прэзыдыум ЦПСПБ пастанавіў адкрыць у Менску цэнтральныя паўтарамесячныя антырэлігійныя курсы на 100 чалавек і ў акругах месячныя курсы на 50 чалавек. Курсы будуць рыхтаваць антырэлігійных прапагандыстых.

— **Прэм'яваньне рыбацкіх арцеляй.** Белкаапсаюз адпусьціў 120.000 мэтраў мануфактуры і 150 скрынак махоркі для прэм'яваньня рыбацкіх арцеляй. Полацкай акрузе вызначана з гэтага фонду 40 скрынак махоркі. Мазырскай—25 і г. д.

— **Вячэрняе аддзяленьне ВТНУ.** Прэзыдыум ЦПСПБ згадзіўся з прапановай менскіх тэхнікаў-будаўнікоў і мэталістых аб адкрыцьці пры новым ВТНУ вячэрняга аддзяленьня, дзе-б тэхнікі змаглі атрымаць адукацыю, не адрываючыся ад вытворчасьці.

— **Тэатры БССР на ўсесаюзнай алімпіядзе.** З 15-га чэрвеня па 6 ліпеня ў Маскве будзе адбывацца ўсесаюзная тэатральная алімпіяда, у якой прымуць удзел БДТ-1 і яўрэйскі тэатр БССР. БДТ-1 пакажа тры сваіх лепшых пастановкі—«Мост»—Рамановіча, «Міжбур'е»—Кудзіна і «Гута»—Іахматага. Яўрэйскі тэатр таксама дасьць тры пастановкі.

— **Пабудова аўдыторнага корпусу БДУ.** Да 1-га жніўня канчаецца пабудова апошняга гадовага аўдыторнага корпусу ўніверсытэцкага гарадка. Урачыстае адкрыцьцё гарадка адбудзецца ў кастрычніцкія святы. Зараз праводзіцца работа на плянаўраўны тэрыторыі гарадка, робяцца дарожкі, тратуары і г. д.

За пагоршаньне якасьці прадукцыі--да адказнасьці

ЦВК і СНК дапоўнілі крымінальны кодэкс спэцыяльным артыкулам, які карае за пагоршаньне якасьці прадукцыі і за парушэньне агульна-саюзных стандартаў.

Паводле гэтага закону сэктар рацыяналізацыі ВСНГ пастанавіў узьняць справу перад пракурорам Менскругі аб прыцягненьні да крымінальнай адказнасьці адміністрацыю тамбоўскай суконнай фабрыкі за пагоршаньне якасьці суконных матэрыялаў. Пагоршаньне якасьці прадукцыі, якую выпускае тамбоўская фабрыка, падрывае работу менскай шыўнай фабрыкі «Кастрычнік» і перашкаджае выкананьню праграмы пляну.

З лістоў рабселькораў

КРАМЫ ПУСТУЮЦЬ

У **Копыскім** раёне тры каапэрацыйныя арганізацыі: **Стараселье, Маслані і Янаўлевічы** ўвайшлі ў больш буйное каапэрацыйнае аб'яднаньне. Гэтае мерапрыемства дало магчымасьць скарацінь выдаткі на ўтрыманьне апарату. Але разам з гэтым значным тормазам у рабоце зьяўляецца адсутнасьць тавараў. Калі раней Днепрасаюз адпускаў на тры каапэрацыйныя арганізацыі тавар, дык зараз адпускае параўнаўча з ранейшай нормай усяго трэцюю частку. Такім чынам, зварот скараціўся з 10 тысяч руб. да 2 тысяч. У выніку гэтага ў вёсках крамы засталіся пустымі. Каапэратары пасылаюць фурманкі па тавар за 25 вёрст, але апошнія варочаюцца ні з чым.

Такая эканомія не дае ніякага эфэкту. Днепрасаюз гэтым пытаньнем павінен зараз-жа зацікавіцца.

І. Х.

У ФОНД ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ КРАІНЫ

Рабочыя, якія заняты на пабудовах **дому ўраду і унівэрсытэцкага гарадка,** пастанавілі адлічыць у карысьць індустрыялізацыі краіны і проц. зарплаты. Табэльшчык **Міхалюк** на агульным сходзе заявіў, што ён на працягу нядзелькі будзе кожны месяц уносіць на 1% з месячнай зарплаты на карысьць індустрыялізацыі і калектывізацыі краіны і выклікаў усю адміністрацыю пайсьці па яго прыкладзе.

І. БАРСУК.

ЦІ РАЦЫЯНАЛЬНА ГЭТА?

МЦРК выцьсьціў новыя заборныя каапэрацыйныя кніжкі вялікага фармату.

Ці патрэбны наогул такія вялікія кніжкі?

Такія кніжкі не патрэбны. Факт той, што старыя кніжкі далёка цалкам не скарыстаны, а іх МЦРК зараз пачне ануляваць. Маюць месца такія факты, калі адна сям'я мае па 3-4 каапэрацыйныя кніжкі. Каб атрымаць, якія-небудзь прадукты, трэба несьці цэлае бярэмя кніжак, што абцяжарвае пайшчыкаў і стварэцца чарга, бо трэба ў кожнай кніжцы рабіць адзнакі. На такія кніжкі няма шмат паперы.

Ці рацыянальна гэта?

ПАЙШЧЫК.

АНТЫСАНІТАРНЫ СТАН СТАЛОЎКІ

Грамадзкая сталоўка ў м-ку **Крупках** (Аршаншчына) знаходзіцца ў антысанітарным стане. На падлозе панарастала на тры вяршкі гразі, сталы, вокны, лаўкі брудныя, на сьценах павукі павілі сабе гнёзды.

Абеды афіцыянты падаюць у брудных вопратцы і ў гэтай самай вопратцы яны корміць сьвіней. Якасьць абедаў дрэнная, а каштуюць яны дорага.

У сталоўку заходзяць асобы з гарэлкай напаюцца і хуліганяць, а адміністрацыя на прымае ніякіх мер для зьніжэньня паказаных недахопаў.

Падзвычай дрэнна стаіць справа з цэнамі ў буфэце. За розныя прадукты буфэт бярэ ў 3-4 разы даражэй звычайнай цаны.

Кіраўнікі спажывецкай каапэрацыі не распачалі яшчэ агляду грамадзкага харчаваньня.

А.

РАЗЬБІРАЮЦЬ НАСЕННУЮ БУЛЬБУ

Калгасу імя **Сталіна** ў вёсцы **Руданова,** Хойніцкага району, сельсавэтам перадана ўся кулацкая маемасьць. Але праўленьне калгасу ня прымае ніякіх мер для таго, каб гэтай маемасьці не расьцягвалі.

Насенную бульбу бяруць, хто хоча і колькі хоча. Ніякага падліку няма. Другі факт. Калгасьнік **Ермаленка** Кастусь даганяў сьвіней. Потым яго выклучылі на курсы. Пры адъезьдзе на курсы гэты актывісты» забыў сьвіней сабе на дарогу, а пры пераводзе калгасу на новы статут забраў з калгасу лепшую карову, а сваю горшую пакінуў.

КАЛГАСЬНІК.

АДПУСКНІКІ!

ВАМ БУДЗЕ ПАСЫЛАЦЦА газэта „ЗЬВЯЗДА" па месцы знаходжаньня ў водпуску без асобнай даплаты.

Не забудзьцеся паведаміць у к-ру газэты «Зьвязда»

ВАШ НОВЫ АДРАС.

З калгасаў пішуць

— **Брыгадзір т. Арлёнак з Багушэўскага раёну паведамляе,** што на чале калгасу **«Чырвоны Садоўнік»** стаіць сын былога стражніка С. Карповіч. Атрымаўшы 12 пар ботаў, ён разьмеркаваў іх між 12 пар ботаў, ён разьмеркаваў іх між 12 пар ботаў, ён разьмеркаваў іх між паміж сваякамі. Старшыня калгасу акружыў сабе сваякамі. Рэдка хто адважваецца выступіць супроць яго. З прычыны такога кіраўніцтва, беднота пачала выходзіць з калгасу. Калі адзін з членаў калгасу—бурэй выступіў з крытыкай працы праўленьня, дык старшыня калгасу крыкнуў: «Замаўчы жыд, бо павытаўскаем».

Падрыхтоўчая работа да сяўбы праведзена надзвычай дрэнна.

— Калгас **«Шчырая Праца», Дрысенскага раёну,** арганізавана прыступіў да сяўбы,—піша селькор П. Спачатку мелі месца выпадкі выхаду з калгасу, але пасьля ня сваёй спэцыяльнасьці.

— Добра праведзена **праверка** падрыхтоўкі да сяўбы **ў Глускім раёне.** У праверцы,—піша т. Гантароў,—прымала ўдзел 450 чал. Яна паказала, што ня ўсе калгасы пераведзены на новы статут, што нездавальняча пастаўлена работа з беднатой. У раёне—32 калгасы, а групы беднаты арганізаваны толькі пры 21 калгасе. Зусім слаба праводзіцца растлумачэньне аб новым палатку і льготах.

— Узорна праводзіцца работа **ў калгасе «Савецкая Беларусь» (Рудзінскі сельсавет, Сьмілавіцкі раён).** Тав. Пескуп паведамляе, што арганізаваны брыгады, якія прыступілі да работы поўнасьцю.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

АД МЕНСКАЕ АКК КП(б)Б

Выклікаюцца 8-га мая на 18 з палов. гадз. у МенАКК (вул. Энгельса, 28) для разгляду спраў наступныя т.т.:

Краснасельскі Я. Г.—шпалерная ф-ка, **Бляўскі Т. Ф.**—Працасьветы, **Завусьцінскі В. Ю. і Саўкоўскі Б. Г.** — завод «Камунар», **Корань І. М. і Манцукевіч Ю. К.** — малы рамонт, **Гвоздовіч І. А.**—п/к харчавікоў, **Цупрынскі Я. А.**—Белдзяржбуд, **Гольдбэрг С. А. і Лабанаў В. С.** — ф-ка «Адраджэньне», **Пітковіч Р. Р.** — завод «Камунар», **Сімончык П. Л.**—5-ты узвод аховы, **Тарасюк Ц. А. і Паміранскі А. Я.**—дэпо таварная, **Левін А. Б.**—шчацінная ф-ка, **Дранікаў С. С.**—служба экспл. ст. Менск, **Рубін А. З. і Бэйнінсон А. Г.**—п/к «Паліграф». Апрача паказаных таварышоў абавязкова павінны зьявіцца сакратары ячэек, дзе гэтыя т.т. знаходзяцца, і старшыні праверкомаў, якія праваралі гэтыя ячэйкі.

СЁНЬНЯ

Дом Камасьветы. У 19 гадз., пак. 21, індывід. кансультацыя па ленінізьме т. **Саевіча** і па палітэканоміі т. **Лур'е.**

Дом Асьветы. У 19 гадз. агульны сход калектыву ЛКСМБ Працасьветы. Яўка камсамольцаў абавязкова.

Клюб саўгандальслужачых. Кіно-карціна «Замаўч». Пач. 1-га сэансу ў 19 з палов. гадз. і 2-га — у 21 гадз. Білеты 15 кап.—у касе клюбу з 14 гадз.

Да ведома членаў саюзу нархарч. У 19 гадз. у клюбе нархарч (Энгельса, 6) — агульны сход пісьменных і малапісьменных.

Пэдгабінэт. У 19 гадз. — канфэрэнцыя выкладчыкаў нямецкае мовы. Даклад т. Пэцальда — значэньне слоў і іх засваеньне.

— У 20 гадз. — сэкцыя палітэхнічнага выхаваньня. Дакл. дзіц. саду № 1 —палітэхнічнае выхаваньне ў дашкольных установах. Яўка дашкольніц абавязкова.

БДУ. У 18 гадз. (Актавая заля)—адкрыты агульны партсход яч. КП(б)Б Пэдфаку. Запраш. беспартыйныя і камсамольцы.

Пэдфак (фіз. аўдыторыя). У 18 гадз. 15 мін. заняткі антырэлігійнага унівэрсытэту. Яўка слухачоў абавязкова.

Пасяджэньне Бел. т-ва нэўрапатолёгаў і псіхіятраў. Парадак дня: 1. дэманстрацыя хворых і 2. хронаксіметрычныя дасьледваньні пры фізіялёгічных і паталёгічных працэсах. Даклад. дад. **Маркаў і Кантар.** Пач. у 20 з палов. гадз. у пам. нэрвовай клінікі.

1-я хірургічная клініка. Пасяджэньне хірургічнай сэкцыі ў 21 гадз. Парадак дня: 1) дэманстрацыя хворых, 2) даклад д-ра Сьцельмашонка — параненьне галавы і 3) плян працы сэкцыі.

Дом Асьветы. У 20 гадз. шахматнай сустрэча Дому Працасьветы з клюбам імя Розы Люксэмбург. Запрашаюцца асьветнікі шахматыстыя.

Кастрычн. РК КП(б)Б склікае нараду па пытаньні сканчэньня парт. навучгоду ў АПШ. Выклік. усе прапагандыстыя АПШ раёну і асабіста т.т. **Кугэль** (радыё-унівэрсытэт), **Трус** (ВДУ), **Гінзбург** (БКС), **Юргенсон** (ЦКК РСІ) і **Дубравіцкі** (Юнг. Арб.). Запраш. сэкцыі вучобы.

Заняткі 2-й групы дэлегатак Фрунзэ раёну. Пач. у 19 гадз. у **Доме Працасьветы.**

Клюб глуханямых. Чыстка цэнтральнага апарату МЦРК. Пач. у 20 гадз. Просьба пайшчыкаў і прапаўнікоў прыбраўку прыняць удзел у чыстцы.

ЗАЎТРА

Дзкадны камвуз. Заняткі на эканамічным курсе у 18 гадз. Тэма: асноўныя праблемы савецкай эканомікі. Лектар **Аксэльрод.**

Пасядж. прэзыдыуму ЦК МОПР'У БССР у 19 гадз. Запраш. члены прэзыдыуму ЦК, члены ЦК, што знаходзяцца ў Менску, і мопр. актыў гор. Менску.

У чацьвер, 6-га мая ў 19 гадз. у клюбе друкароў (Ленінская вул.) АГУЛЬНЫ АДКРЫТЫ СХОД ПАРТКАЛЕКТЫВУ РЭДАКЦЫЙ ГАЗЭТ і ДРУКАРНІ «ЗЬВЯЗДА». Парадак дня 1) даклад аб выніках апошняга пленуму ЦК КП(б)Б і 2) паведамленьне аб пастановах бюро партколектыву.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

РАБОЧЫ КЛЮБ Нова-Барысаў 7 мая

Культороп Барысаўскага РК КП(б)Б СКЛІКАЕ Сёньня, а 7 гадз. увеч. АГУЛЬНЫ СХОД РАБОЧЫХ 4-х ПРАДПРЫЕМСТВАЎ

ПАРАДАК ДНЯ: 1. Даклад аб дні друку і работе газэты «Зьвязда». Для дакладу прыязджае прадстаўнік рэдакцыі «Зьвязда»

Культороп РК КП(б)Б

ЦП саюзу саўгандальслужачых 8-га мая а 8 гадзіне ўвечары ў памяшканьні вайсковага кутку клюбу саўгандальслужачых склікае НАРАДУ РАБКОРАЎ, СЬЦЕНКОРАЎ, РЭДКАЛЕГІЙ НАСЬЦЕНГАЗЭТ І КУЛЬТАКТЫВУ САЮЗУ.

У ПАРАДКУ ДНЯ: 1. Абгаварэньне зьместу беларускай старонкі ў «Нашей Газете», у зьвязку з чысткай «Нашей Газеты». 2. Розное.

Яўка рабкораў, сьценкораў, родкалегій насьценгазэт і культактыву саюзу абавязкова.

РЭСП. БЮРО АРУ. 8-га мая, а 6 з пал. гадз. увечары ў памяшканьні АРУ (Савецкая, 65) адбудзецца НАРАДА РАХУНКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ--ДОБРААХВОТН КАЎ і БРЫГАДЗІРАЎ, якія зьвяртаюцца з часовай працы ў калгасах, сумесна з с.-г. сэктарам АРУ.

ПАРАДАК ДНЯ: 1. Інфармацыя добраахвотнікаў аб становішчы вузоту у калгасах. 2. Аб удзеле зьвярнуўшыхся добраахвотнікаў у працы с.-г. сэктару АРУ.

Просьба да ўсіх добраахвотнікаў—рах. прапаўн. абавязкова зьявіцца на гэту нараду.

Да ведама студэнтаў завочнага рабфаку

Дэканат Менскага Завочнага Рабфаку даводзіць да ведама студэнтаў, што з 20 ПА 25 МАЯ г. г. адбудзецца

праверка ведаў студэнтаў рабфаку і канфэрэнцыя з акадэмічна адстаўнымі таварышамі

Для атрыманьня літару з 50 проц. скідак па чыгунцы, усім студэнтам да вызначанага тэрміну всабходна паведаміць рэфак аб прыезьдзе на канфэрэнцыю або іспыты. Адначасова паведаміць чыгуначную станцыю, з якой патрэбна выяжджаць (палустанак і разьезд вызначыць на трэба).

Нам. дэкана рабфаку ЯКАЎЛЕЎ

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА

Выключнае вынаходніцтва дэманстраваньне музычнага інструмэнту „БАТЫШЧ-ТОН", які замяняе аркестр. Выканаўцы А. Г. і О. В. ТУЛЬСКІЯ БАТЫШЧАВЫ пры ўдзеле артыстых „МЮЗІК-ХОЛ" на экране ЮЛЬКА КАМУНАРА ў 6 частях. Пачатак: 7 г., 8 г. 30 м., 10 г. 15 м. Каса—ад 5 г. дня.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ

Замежны мастацкі фільм Чалавек, які сьмяецца па раману Віктара Гюга. У галоўнай ролі Конрад Вэйдт. Пачатак 1-га сэансу з 7 гадз. увечары. Каса ад 5 гадз.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ

ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ НУРЫ кіно-п'єса ў 6 частках. Пачатак 1 сэансу з 7 г. Каса адкрыта ад 5 гадз.

1-ы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"

2 фільмы ў адзін сэанс 1) культурфільм АЛТАЙ КІЖЫ ў 5-ці частках 2) замежная камедыя ЦІХАЯ СЯМЕЙКА ў 2 частках. Пачатак 1-га сэансу з 2 г. Каса адкрыта ад 12 гадз.

КІНО СПАРТАК

Мастацкі спартыўны фільм з выкл. «ЧЭМПІЁН СЬВЕТУ» 11 ЧАРЦЕЙ У галоўных ролях знакомыя кіно-артыстыя ЛЮСІ ЛАРНО і ГУСТАЎ ФРЭЛІХ. Пачатак з 7 г., 9 г. і 10 г. 45 м. Каса—ад 5 г. дня.

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДНЫМІ КАСАМІ БССР абвяшчае, што з 15 красавіка г. г. пачалася ПРАДАЖА ВЭЛЁСЫПЭДНЫХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ, выпушчаных Усесаюзным аб'яднаньнем машынабудаўнічай прамысловасьці, згодна пастановы Савету Народных Камісараў Саюзу ад 26 сакавіка г. г., рэалізацыя якіх ускладзена на АШЧАДНЫЯ КАСЫ.

Усіх вэлёсыпэдных абавязацельстваў выпушчана 350 тысяч, з якіх БССР прадастаўлена 7625.

КОШТ ВЭЛЁСЫПЭДУ УСТАНОЎЛЕН У 160 РУБ.

Абавязацельствы выпускаюцца ў 4 сэрыі:

Тэрмін абавязацельства I сэрыі —1 красавіка 1931 г.
« « II « —1 жніўня 1931 г.
« « III « —1 красавіка 1932 г.
« « IV « —1 жніўня 1932 г.

Аплачваюцца абавязацельствы ў РАСТЭРМІНОЎКУ.

Наменьшым абавязацельствам даецца права аплачваць кошт вэлёсыпэду ПОЎМЕСЯЧНЫМІ, МЕСЯЧНЫМІ АБО КВАРТАЛЬНЫМІ (3-х месячнымі) узносамі ў строга вызначаных сумах, у залежнасьці ад сэрыі абавязацельстваў. На суму, унесеную для аплаты абавязацельстваў, налічваецца ў карысьць уладальніка абавязацельстваў 6 проц. гадавых. Пасьля поўнай аплаты абавязацельстваў уладальні іх неадкладна атрымліваюць са складу «ДЗЯРЖШВЭЙМАШЫНЫ» НА РУКІ ВЭЛЁСЫПЭД (выпуску маскоўскага, ленінградскага або харкаўскага заводаў)

Падпіска прымаецца ва ўсіх ашчадных касах (акрамя агенцый) і філіялаў Дзярбанку ў межах вызначанай колькасьці вэлёсыпэда